Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 131 (4035)
ПАНЯДЗЕЛАК, 18 МАЯ
1931 г.
Цэна нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Аўладаць тэхнікай гаспадарчага разрахунку

Ажыцьцяўленьне новай сыстэмы крэдытаваньня, накіраванай на ўкараненьне пачатку гаспадарчага разрахунку, штодзенны кантроль рублём зьяўляецца аднэй з рашаючых умоў выкананьня рэдна-гаспадарчага пляну трэцяга году, завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Гаспадарчы разрахунак павінен стаць асноўным мэтадам кіраўніцтва дзяржаўнай гаспадаркай, сапраўднай школай сацыялістычнага плянаваньня і гаспадараньня.

Партыяй і ўрадам гэта пытаньне пастаўлена як кардынальнейшая задача партыйных і гаспадарчых арганізацый, задача, на вырашэньне якой павінны быць мабілізаваны найшырэйшыя масы рабочай клясы і ўсіх працоўных. Ажыцьцяўленьне новых паправак крэдытнай рэформы павінна быць забясьпечана поўнасьцю і ў найкарацейшы тэрмін.

Прынцыпы гаспадарчага разрахунку, натуральна, сустракаюць шапёнае супраціўленьне ўсіх апартуністычных элемэнтаў.

Правыя апартуністы імкнуцца сарваць гэта важнейшае мерапрыемства партыі шляхам выпустошваньня папітычнага сэнсу гаспадарчага разрахунку, Дзейнасьць шкодніцкіх арганізацый, якая была накіравана да дэзарганізацыі грашовай гаспадаркі, да зрыву крэдытнай рэформы, знайшла ў радзе выпадкаў пры першапачатковым правядзеньні крэдытнай рэформы спрыяючую глебу, іменна дзякуючы адсутнасьці напежнага адпору і фактычна аб'ектыўнага падтрыманьня з боку апартуністаў з правага пягеру. Не дарма, прававапартуністычныя ўстаноўкі знаходзілі самыя спачувальныя адносіны шкодніцкай зграі. Не дарма шкодзікі марылі аб перамозе правых, непасрэдна зьвязваючы гэта з надзеямі на рэстаўрацыю капіталізму.

Але ня менш небясьпечнымі зьяўляюцца «лева»-апартуністычныя тэндэнцыі ігнараваньня значэньня грошай, тавараабароту, адмаўленьня ролі крэдыту, як магутнай зброі кантролю выкананьня вытворчых заданьняў. Усе гэтыя «тэорыі» ня маюць нічога агульнага з генэральнай лініяй партыі і вядуць да скажэньня сутнасьці апошняга этапу нэпа, няўхільна цягнуць небясьпечнае перакананьне праз тавараабарот да непасрэднага прадуктаабмену. Падобнага роду «лявацкія» ўстаноўкі рашуча асуджаны партыяй, што яшчэ раз з усёй сілай падкрэслена ў апошнай пастанове ЦК і СНК аб рабоце спажывецкай кааперацыі.

Барацьба за чыстату генэральнай лініі партыі ў пытаньнях плянаваньня і кіраўніцтва народнай гаспадаркай, бязьлітасная выкрыцьцё і жорсткі адпор усім апартуністычным скажэньням зьяўляецца асноўнай умовай пасьпяховага ажыцьцяўленьня новай сыстэмы крэдытаваньня і гаспадарчага разрахунку.

У справе выкананьня дырэктыў партыі маюць вялізарнае значэньне ТЭМПЫ ПЕРАБУДОВЫ работы прамысловасьці і гаспадарчых арганізацый на аснове гаспадарчага разрахунку.

Між тым, у гэтых адносінах мае месца асабліва недапушчальнае адставаньне. Недаацэнка ролі новай сыстэмы крэдытаваньня з боку некаторых партыйных арганізацый і раду гаспадарнікаў прывяла да значнага спазьненьня. З 1 мая папраўкі да крэдытнай рэформы поўнасьцю ўступілі ў моц, між тым у БССР яшчэ далёка не закончана і зараз першая падрыхтоўчая стадыя крэдытнай рэформы — заключэньне дагавораў, падрыхтоўка фінпляну́ў і балянсаў. Падобнае становішча характэрна ня толькі для кізавых зьвеньняў прамысловасьці і гаспадарчых арганізацый, але ў цэлым радзе і для цэнтральных устаноў. Так, дагаворная кампанія і афармленьне дакумантаў, неабходных для атрыманьня крэдытаў, ня скончана па Белкаапсаюзе, Лесбеле і радзе аб'яднаньняў. У раёнах дагаворная кампанія толькі пачынае разгортвацца.

З боку ЯКАСЬЦІ заключаныя дагаворы ў абсалютнай большасьці мелі буйнейшыя недахопы, што цягнула шматлікія папраўкі. Бюракратычнае разуменьне крэдытнай рэформы, імкненьне застрахаваць сябе ад якой небудзь матар'яльнай адказнасьці прыводзілі да скажэньня сэнсу дагавораў, выпустошваньня асноўнага іх значэньня, да адсутнасьці выразных абавязацельстваў бакоў, адказнасьці за няўстойку, квартальных сум паставак, форм разрахунку і г. д. Асабліва ў гэтых адносінах агідна стаяла справа ў Белдзяржснабе і Лесбеле, дагаворы якога поўнасьцю забракаваны. Недапушчальная зацяжкі меліся і ёсьць яшчэ і зараз са спускам на пэрыферыю лімітаў.

Найбольшая непадрыхтаванасьць да ажыцьцяўленьня новай сыстэмы крэдытаваньня аказваецца ў рэспубліканскіх філіялах саюзных гаспадарчых арганізацый (Саюзмяса, Саюзмалако і інш.), а таксама ў Лесбеле, БКС, запалкавага аб'яднаньня, мясцовай прамысловасьці і будаўнічых арганізацый. Зусім недапушчальныя адносіны правілі Белсельгасснаб, Інбантрэст, Сьвінатрэст, Маспатрэст, Інбанпенкасаюз, якія да самых апошніх дзён пальцам ня кранулі для падрыхтоўкі да рэформы і нават зусім не зьяўляліся ў Дзяржбанк па пытаньнях адкрыцьця крэдытаў.

Ня дзіўна, адсюль што на сёнешні дзень з ліку арганізацый, якія знаходзяцца на вучоце Белдзяржбанку, БОЛЬШАЙ ПАЛОВЕ ЯШЧЭ НЕ АДКРЫТЫ КРЭДЫТЫ, што, натуральна, пагубна адбіваецца на ходзе выкананьня гаспадарчых плянаў.

Трэба проста сказаць, што нездавальняючы ход дагаворнай кампаніі, усёй падрыхтоўкі да новай сыстэмы крэдытаваньня тлумачыцца непадрыхтаванасьцю гаспадарчых арганізацый, нежаданьнем па-сапраўднаму ўзяцца за справу, не адзінкавым праяўленьнем дзяляцтва, бескапотнасьці.

На самай справе, чым можа быць вытлумачана грабавое маўчаньне пералічаных вышэй арганізацый? Чым можна, напрыклад, апраўдаць хаця-б такі факт, калі Белсхураб'яднаньне на цэлы месяц спазьняецца з разьмеркаваньнем зваротных сродкаў і ставіць гэтым сябе пад моцны ўдар, у выключна цяжкія фінансавыя ўмовы.

Ва ўсім гэтым з боку раду гаспадарнікаў у пэўнай долі сказваецца апартуністычная недаацэнка новай сыстэмы крэдытаваньня, адлюстраваньне супраціўленства дырэктывам партыі, неразуменьне важнасьці КОЖНАГА ДНЯ для барацьбы за народна-гаспадарчы плян на аснове гаспадарчага разрахунку, наяўнасьць апартуністычных тэндэнцый да максімальнай расьцяжкі тэрмінаў рэформы, мэханічнага адрыву перабудовы ад самой работы.

Вельмі нездавальняюча стаіць справа з непасрэдным укараненьнем гаспадарчага разрахунку на прадпрыемствах, у прыватнасьці ў ЦЭХАХ. Тут зроблена яшчэ недапушчальна мала. Аб'яднаньні не аказваюць належнай дапамогі прадпрыемствам у гэтай справе. У самым ВСНГ яшчэ няма адказнай асобы, якая-б непасрэдна ведала пытаньнямі пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак, абагульвала-б вопыт, кіравала-б гэтым важнейшым пытаньнем прамысловага будаўніцтва.

У выніку на прадпрыемствах вялікі разнабой, факты грубага скажэньня ідэі гаспадарчага разрахунку. Так, на «Чырвоным мэталісьце» ўнутрызаводзкія дагаворы заключаны не на аснове прамфінпляну, а... сярэдняй выпрацоўкі. У наяўнасьці факт легалізацыі скарачэньня вытворчых заданьняў. Увесь гаспадарчы разрахунак у цэхах праведзены фармальна і не дае эканамічнага эфэкту.

У большасьці прадпрыемстваў гаспадарчы разрахунак у цэхах яшчэ не ажыцьцёўлен, зусім яшчэ не ўкараніўся ён у работу БРЫГАД. У гэтых адносінах вопыт перадавых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу зусім не знайшоў свайго ўжываньня.

Самую моцную трывогу выклікае амаль поўная адсутнасьць работы па пераводзе на гаспадарчы разрахунак САУГАСАЎ І МТС.

У ланцугу прычын, якія цягнуць спабыя тэмпы ажыцьцяўленьня новай сыстэмы крэдытаваньня і ўкараненьня гаспадарчага разрахунку, нельга не адзначыць СЛАБУЮ МАСАВАСЬЦЬ вакол гэтых пытаньняў. Прафорганы, пачынаючы з ЦСПСБ, ЦП саюзаў і канчаючы нізавымі арганізацыямі, уключыліся ў гэту работу з недапушчальным спазьненьнем. Партыйныя арганізацыі на місцах у радзе выпадкаў таксама не аддаюць выстарчальнай увагі пытаньням гаспадарчага разрахунку. Адсюль — шматлікія факты бюракратычнага габінэтнага заключэньня дагавораў, фармальнага правядзеньня гаспадарчага разрахунку. Заводзкая грамадзкасьць не мабілізавана яшчэ вакол пытаньняў новай крэдытнай рэформы.

Нарэшце, трэба ўказаць істотныя недахопы ў рабоце БЕЛДЗЯРЖБАНКУ і яго філіялаў на місцах, якія таксама аказаліся слаба падрыхтаванымі ў адносінах ліквідацыі запускаў падліку, расчысткі і праверкі рахункаў і г. д. У гэтай сувязі нельга не ўказаць, што НКПрацы да гэтага часу ня выканаў пастановы СНК БССР аб мабілізацыі 90 чал. рахунковых работнікаў для ўмацаваньня органаў банку.

Становішча з правядзеньнем новай сыстэмы крэдытаваньня ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Тут патрэбен рашучы, карэнны паварот у бок хуткага і выразнага правядзеньня дырэктыў партыі і ўраду.

Практычныя баявыя задачы сёнешняга дня — неадкладна забясьпечыць заключэньне пёкальных дагавораў, скончыць перагляд тых з іх, якія прызнаны дэфэктнымі, скончыць складаньне фінпляну́ў і плянавых балянсаў, падагнаць справаздачныя балянсы. Шпаркімі тэмпамі ўкараніць гаспадарчы разрахунак у брыгады, цэхі, прадпрыемствы, саўгасы, МТС. Перабудаваць на аснове гаспадарчага разрахунку, кантролю рублём усе галіны дзяржаўнае гаспадаркі. Забясьпечыць поўнае ВЫКАНАНЬНЕ ўзятых паводле дагавораў АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ. Зрабіць паход за аўладаньне тэхнікай гаспадарчага разрахунку рухам мільёнаў, прыкаваць да гэтага пытаньня ўвагу ўсёй КП(б)Б, усяе рабочае клясы і працоўных мас.

На аснове генэральнай лініі партыі, вядучы жорсткую барацьбу з апартуністычнымі элемэнтамі, мы рушым баявым тэмпам ажыцьцяўленьне крэдытнай рэформы, зробім гаспадарчы разрахунак сапраўдным мэтадам кіраваньня дзяржаўнай гаспадаркай, забясьпечым поўнае выкананьне праграм трэцяга году пяцігодкі.

Жахлівыя вынікі паводкі ў Заходняй Беларусі

ТЫСЯЧЫ СЕМ'ЯЎ ЯШЧЭ І ЦЯПЕР—ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Акупанты сьпешна аднаўляюць масты на ваенна-стратэгічных дарогах

ГОЛАД СЯРОД ПАЦЯРПЕЎШЫХ

Таго вялізарнага зьнішчэньня, якое зроблена паводкай гэтай вясной у Заходняй Беларусі, і таго распачлівага становішча, у якім зараз знаходзяцца дзесяткі тысяч пацярпеўшых сем'яў—ня можа ўтаіць нават фашысцкі буржуазны друк Польшчы. Час ад часу на старонках віленскіх фашысцкіх газэт падаюцца весткі, хаця далёка і няпоўныя, на аснове якіх акрэсьліваецца пэўны малюнак становішча пацярпеўшых ад паводкі. Так, ЯШЧЭ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ТЫСЯЧЫ СЕМ'ЯЎ ЖЫВУЦЬ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ, СЯРОД ІХ ЛЮТУЕ ГОЛАД І ЭПІДЭМІІ РОЗНЫХ ЗАРАЗЬЛІВЫХ ХВАРОБ, ЯК ТЫФУС.

Наколькі грознае становішча стварылася ў сувязі з паводкай, сьведчыць той факт, што фашысцкая ўлада віленскага ваяводзтва прымушана была склікаць «вялікую нараду ўсіх старостаў пацярпеўшых ад паводкі паветаў, прадстаўнікоў бяспечнасьці і г. д. Зразумела, што мэтай гэтай нарады старостаў не зьяўляецца дапамога пацярпеўшым працоўным масам, а абмеркаваньне пытаньняў дапамогі ПАМЕШЧЫКАМ, КУЛАКОМ І АСАДНІКАМ.

Як падае фашысцкі «Кур'ер Віленскі» ў № 111, «вынікі паводкі настольні катастрафічныя, што насельніцтва многіх мясцовасьцяй нават у 1932 г. ня будзе мець свайго хлеба».

Далей з афіцыяльных справаздач на гэтай нарадзе старостаў вынікае, што, напрыклад, у СЬВЯНЦЯНСКІМ ПАВЕЦЕ «ЗЬНІШЧАНЫ 524 ГЭКТАРЫ ПАСЕВАЎ. Страты прыватных асоб складаюць 182 ТЫС. ЗЛОТЫХ, а разам са стратамі самаўрадаў—250 ТЫС. ЗЛОТЫХ.

У павеце ВІЛЕНСКА-ТРОЦКІМ ЗЬНІШЧАНЫ 184 ГЭКТ. ПАСЕВАЎ І 81 ГЭКТ. часткова пашкоджан. Сума страт прыватных асоб складае 170 ТЫС. ЗЛОТЫХ, самаўрадаў—43 ТЫС. ЗЛОТЫХ.

У АШМЯНСКІМ ПАВЕЦЕ страты складаюць суму ў 106 ТЫС. ЗЛОТЫХ.

У павеце МАЛАДЗЕЧАНСКІМ АД ПАВОДКІ ПАЦЯРПЕЛА 4 ВОЛАСЬЦІ І 2 МЯСТЭЧКІ. Занесена пяском і ілам 485 ГЭКТАРАЎ ПАСЕВАЎ І 134 ГЭКТАРАЎ СЕНАЖАЦІ. Наогул, страты ў гэтым павеце вылічаюцца ў 200 ТЫС. ЗЛОТЫХ. У павеце ВІЛЕЙСКІМ страты ад паводкі вылічаюцца ў 320 ТЫС. ЗЛОТЫХ, у ПАСТАЎСКІМ—240 ТЫС. ЗЛОТЫХ». Найбольш усяго пацярпелі ад паводкі паветы БРАСЛАЎСКІ І ДЗІСЬНЕНСКІ, а таксама НАВАГРАДЧЫНА.

Так, у Браслаўскім павеце страты прыватных асоб складаюць звыш 900 тыс. злотых, ня лічачы страт гандляроў лесам, самаўрадаў і г. д. Нават фашысцкая газэта зазначае, што «ў гэтым павеце ПОЎНАСЬЦЮ ЗЬНІШЧАНА 200 БУДЫНКАЎ, А 433—ПАШКОДЖАНЫ. Занесена пяском і ілам 2333 ГЭКТАРЫ ПАСЕВАЎ, 1249 ГЭКТ. СЕНАЖАЦІ, 56 ГЭКТ. ГАРОДАЎ, 1172 ГЭКТ. ЗАНЕСЕНА ПЯСКОМ У МЭТР ТАЎШЧЫНЕЮ. Заліта вадою было звыш 30 мясцовасьцяй. Ад паводкі пацярпела ЗВЫШ 2300 СЕМ'ЯЎ». Як падае манархісцкае віленскае «Слово» за 8 мая, «яшчэ 8 мая абшары, якія знаходзяцца над ракою, часткова яшчэ стаяць пад вадою. Так, У ДЗІСЬНЕ БЫЛО ЗАЛІТА ВАДОЮ 36 ВУЛІЦ, А Ў ДРУІ ТОЛЬКІ 80 ДАМОЎ. НЯ БЫЛІ ЗАЛІТЫ ВАДОЮ. Вада ў Дзісьне паднялася вышэй дамоў і тэлеграфных слупоў. Яшчэ і зараз у горадзе зносіны адбываюцца на лодках».

Страты, паводле няпоўных даных, у Дзісьне вылічаюцца ў ПАЎТАРА МІЛЬЁНА ЗЛОТЫХ. Агульная лічба ПАЦЯРПЕЎШЫХ ЖЫХАРОЎ ДАСЯГАЕ 8 ТЫСЯЧ, з якіх ЗВЫШ 5 ТЫС. ЯШЧЭ ЗАРАЗ ЗНАХОДЗЯЦЦА ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ. У Дзісьненскім павеце страты складаюць ЗВЫШ 300 ТЫС. ЗЛОТЫХ.

Што датычыць страт ад паводкі ў гор. Вільні, дык, як падае дэфэнзыўны «Беларускі звон» у № 11, страты аднаго толькі магістрату роўны 320 тысячам злотых. На адны толькі работы па ўрэгуляваньні разбураных паводкаю берагоў Віліі і Вілейкі трэба будзе ЗВЫШ 9 МЛН. ЗЛОТЫХ. Гэтыя лічбы, зразумела, не датычыць тых вялізарных страт, што панесьлі прыватныя асобы і іншыя ўстановы ў горадзе».

Як паведамляе віленская фашысцкая прэса, страты ў Навагрудчыне асабліва вялікія. «Дакладна страты ня могуць яшчэ быць вылічаны, бо значная частка залітых палёў і пугоў ДАГЭТУЛЬ ЯШЧЭ ПАД ВАДОЙ. Як сьцьверджана дагэтуль, 1500 ГЭКТАРАЎ ЗАСЕЯНЫХ ПАЛЁЎ ЗЬНІШЧАНЫ ЦАЛКАМ, вялізарныя абшары лугоў занесены пяском ды ілам. 102 ДАМЫ ЗЬНЕСЕНЫ ПОЎНАСЬЦЮ, 720 ЗНАЧНА ПАШКОДЖАНЫ. Вялізарная маса—тысячы цэнтнэраў бульбы ў ямах, сена, канюшына, зьнесены вадою. БОЛЬШ 2000 СЕМ'ЯЎ ПАНЕСЬЛІ ЗНАЧНЫЯ СТРАТЫ, прычым 670 СЕМ'ЯЎ ЗРУЙНАВАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ. 9 асоб загінула». Але, як зазначае далей нават дэфэнзыўная газэтка, «ЛІЧБЫ ГЭТЫЯ ЗНАЧНА ПАМЕНШАНЫ». «Асабліва цяжка адбіліся гэтыя страты на насельніцтве таму, што ў мінулым годзе яно страшна пацярпела ад вялізарнай буры з градам (паветы Навагрудзкі, Стаўпецкі і Валожынскі). Тады страты вылічаны былі больш чым на 4 з пал. мільёны злотых».

Вось малюнак таго разбурэньня і таго жахлівага становішча, у якім зараз апынуліся працоўныя масы Заходняй Беларусі, паводле нават фашысцкай прэсы. Як зазначае далей фашысцкі друк, «у сувязі з паводкай на пацярпеўшых ад яе абшарах пашыраюцца эпідэміі розных заразьлівых хвароб, якія яшчэ больш узмацняюцца пагоршанымі ўмовамі жыцьця. Асабліва пашыраецца тыфус».

Як мы бачым, тысячы сем'яў, пераважна вясковай і местачковай беднаты, да гэтага часу знаходзяцца пад адкрытым небам, дзесяткі тысяч галадаюць, а эпідэміі розных хвароб штодня ўносяць у магілу сотні ахвяр. Становішча пацярпеўшых тым больш распачлівае, што яны пакінуты на волю лёсу. Фашысцкі ўрад, як зазначалася ўжо на старонках «Зьвязды», зусім адмовіў у дапамозе пацярпеўшым ад паводкі. Занятаму з гапавою падрыхтоўкай ВАЕННАГА ПАХОДУ НА КІЕЎ І МЕНСК, на што трацяцца мільярды,—польскаму фашызму не да пацярпеўшых ад паводкі. Але што гаварыць аб дапамозе, калі фашысцкая ўлада не дазволіла патраціць пару тысяч злотых на перавозку сапёрных часьцей па чыгунцы для ратаваньня гінучага ў хвалях стыхіі насельніцтва.

Партыйныя нізы ППС кляймяць здрадніцтва сацыял-фашысцкіх правадыроў

ВАРШАВА, 15. Працэс палявеньня партыйных нізоў ППС, які адлюстроўвае нездавальненьне працоўных мас, ідзе ўсё больш шпаркім тэмпам. На лодзінскай канфэрэнцыі ППС 5 дэлегатаў высунулі рэзалюцыю, якая рэзка крытыкуе дзейнасьць II Інтэрнацыяналу і патрабуе пачаць барацьбу за сацыялізацыю капаленъ, буйных фабрык і заводаў і за неадкладную ліквідацыю ваеннай прамысловасьці. Рэзалюцыя пры гэтым падкрэсьлівае, што адзіным узорам сапраўды пралетарскай дзяржавы зьяўляецца гаспадарка СССР.

Сацыял-фашысцкім правадыром удалося сабрать большасьць і азлабленьне дэлегатаў пайшло па лініі асабістых абвінавачаньняў паасобных выдатных кіраўнікоў у «корыстолюбіи», марнатраўнасьці і г. д. Ня гледзячы на ўсю неаформленасьць левай апазыцыі, яна пачынае ўжо выклікаць у пэпэсэсаўскай верхавіны і ўсім буржуазным друку сур'ёзную небясьпеку.

Канвульсыўна прабуючы ўтрымаць свой падаючы ўплыў у масах, некаторыя выдатныя пэпэсэсаўцы ўжываюць «левую» фразэалёгію. У «Роботнік» зьмешчан артыкул Ляліўы, які ўкавае, што ў цяперашні час пытаньні аб СССР немагчыма абыходзіць моўчкі. Паводле слоў Ляліўы, нават буржуазныя і клерыкальныя журналісты адзначаюць правал капіталістычнай сыстэмы ва ўсім сьвеце і шпаркі рост сацыялізму ў СССР.

Ляліва ўказвае, што выпрацаваны Інтэрнацыяналам праект палітычнай рэзалюцыі, у якім няма ўспаміну аб існаваньні Савецкага Саюзу, зьяўляецца — мякка кажучы — неактуальным». З адказам Ляліве —надзвычай бледным і безвымоўным — выступіў лідэр ППС Кваліньскі, які прызнае, што ў рабочых масах існуе недавер'е да кіраўніцтва ППС. (ТАСС).

Катаржны прысуд над вучнямі яўрэйскага тэхнікуму ў Вільні

ВІЛЬНЯ, 13. У Віленскім акруговым судзе адбылася расправа над 2 вучнямі яўрэйскага тэхнікуму М. Басаком і Д. Гардонам.

Абвінавачвалі іх у распаўсюджваньні камуністычных лістовак. Падсудныя ня прызналі сябе вінаватымі. Ня гледзячы, аднак, на гэта суд, на падставе толькі паказаньняў паліцэйскіх і шпікаў, засудзіў абодвых падсудных на 2 гады катаргі.

Кітайскія салдаты распраўляюцца з афіцэрыкай

ШАНХАЙ, 16. Газэта «Саут Чайна Морнінг Пост» паведамляе, што па мінулым тыдні каля Кантону на суднах, пасланых для барацьбы з камуністычнымі атрадамі, загарэлася паўстаньне. Паўстаўшыя забілі афіцэраў. Паўстаньне было хутка задушана. Газэта паведамляе таксама, што ў раёне Сватоу зноў зьявіліся ў вялікай колькасьці атрады кітайскай чырвонай армії. (ТАСС).

Рэпрэсіі супроць рэвалюцыйных рабочых

ЛЕНДАН, 15. Як паведамляюць з Мадрыду, часовы ўрад узмацніе прасьледваньне рэвалюцыйнага рабочага руху, займаючы адначасова крымінэчую пазыцыю ў адносінах да манархістаў. Арышты камуністаў працягваюцца. У Мадрыдзе паліцыя врабіла налёт на мітынг скліканы кампартыяй і арыштавала 14 чалавек. Адначасова вызвалена большасьць арыштаваных гэтымі днямі членаў камітэту манархічнага т-ва.

Пасьля расстрэлу дэманстрацыі—масавыя арышты

ВАРШАВА, 16. У сувязі з расстрэлам першамайскай дэманстрацыі ў Маневічах (Валынскае ваяводзтва) працягваецца масавыя арышты сярод рабочых і сялян. «Пшэглёнд вячэрні» паведамляе аб арыштце 25 «падбухторшчыкаў», якія абвінавачваюцца ў падбухторваньні сялян да супраціўленьня паліцыі. У ліку арыштаваных выдатныя працаўнікі пахаваньня—відоцкага рабочага І. Дзідзюля — члена ППС-лявіцы на паўтара года катаргі, а рэшту 21 абвінавачанага — ад году да 6 гадоў сяцаў турмы.

Але гэты прысуд паказаўся фашысцкай уладзе надзвычай мяккім. Па патрабаваньні пракурора справа апынулася ў апэляцыйным судзе, які, канваюючы загад аўтарытэту, прысудзіў аскарга суда зьмяніў, прыгаварыўшы І. Дзідзюля на 5г од катаргі, Фэйгельмана, Гурвіча, Лапідуса, Буцьман і Дзіванскую — па 4 гады, а рэшту ў кожнасьці 16 чал. ад 3 да 1 году катаргі.

Катаржныя прысуды без канца

ВІЛЬНЯ, 16. 7 сьнежня 1929 году адбылося ў Вільні пахаваньне аднаго кіраўнікоў Грамады гор. Вільні, расстрэлянага Юстына Юхны, які быў замучаны у турме фашысцкімі катамі. На могілках адбыўся вялікі мітынг рабочых, які пасьля пераўтварыўся ў масавую дэманстрацыю супроць фашысцкага тэрору. Пасьля пахаваньня паліцыя пачала шматлікія арышты.

Акруговы суд, праслухаўшы згодна шпікаў і паліцэйскіх, прыгаварыў удзельнікаў пахаваньня—відоцкага рабочага І. Дзідзюля — члена ППС-лявіцы на паўтара года катаргі, а рэшту 21 абвінавачанага — ад году да 6 гадоў сяцаў турмы.

Але гэты прысуд паказаўся фашысцкай уладзе надзвычай мяккім. Па патрабаваньні пракурора справа апынулася ў апэляцыйным судзе, які, канваюючы загад аўтарытэту, прысудзіў аскарга суда зьмяніў, прыгаварыўшы І. Дзідзюля на 5г од катаргі, Фэйгельмана, Гурвіча, Лапідуса, Буцьман і Дзіванскую — па 4 гады, а рэшту ў кожнасьці 16 чал. ад 3 да 1 году катаргі.

Крывавыя выбары ў эгіпэцкі парлямант

ЛЕНДАН. 15 мая. (ТАСС). Першы дзень выбараў у эгіпэцкі парлямант суправаджаўся жорсткімі сутычкамі, 20 чал. забіта і больш 200 паранена.

Учора, у першы дзень выбараў, была абвешчана забастоўка чыгуначнікаў і рабочых арсэналу ў раёне Булак. Бастуючыя зрабілі дэманстрацыйны паход ў другія чыгуначныя цэнтры пад лёзунгам пашырэньня забастоўкі. Войскі, узброеныя кулямётамі, спрабавалі запёрці рабочых у чыгуначных майстэрнях. На пагрозы адкрыць кулямётную страляніну чыгуначнікі адказалі градам каменьняў, пусьцілі таксама ў ход пажарныя шлянгі. Бастуючыя вывелі са строю шмат паравозаў, у выніку чаго спынілася рух кур'ерскіх цягнікоў.

У другім раёне Каіра рабочыя забраліся на дахі майстэрань, адкуль кідалі ў паліцэйскіх распаленыя кавалкі жалеза.

Пры задушэньні хваляваньняў была выслана спэцыяльная лятучая брыгада, якая адкрывала па рабочых страляніну з вінтовак і рэвальвэраў. На галоўнай вуліцы Каіра—Шарыабулак—натоўны рабочых закідалі каменьнем штрэйкбрэхераў, якія пусьцілі трамвайныя вагоны. Рабочым удалося поўнасьцю спыніць вулічны рух. 4 трамвайных вагоны спалены.

У радзе правінцыяльных гарадоў Эгіпту таксама адбываліся хваляваньні. Тэлеграфнае паведамленьне з гэтымі раёнамі перарвана.

Лідэры вафдыстаў (апазыцыйная партыя нацыяналістаў) заяўляюць, што ў выбарах удзельнічае ня больш 10 проц. выбаршчыкаў.

Падзеі ў Каіры і іншых эгіпэцкіх гарадох адзначаюць сабою новы ўздым рэвалюцыйнай барацьбы ў Эгіпце.

Забастоўка рабочых у Каіры зьяўляецца буйнейшай падзеяй у рабочым руху Эгіпту. Пасьля ўзброеных выступленьняў у чэрвені мінулага году, у ходзе якіх мэтад стачкі яшчэ ня ўжываўся, рабочая кляса Эгіпту цяпер бяруцца за зброю палітычнай стачкі.

Нацыянал-рэфармісты здрадзілі вызваленчую барацьбу, капітулявалі перад імпэрыялізмам і прабуюць перавесьці антыімпэрыялістычны рух на рэйкі «барацьбы за канстытуцыю». Гэтым яны хочуць адцягнуць удары ад англійскага імпэрыялізму. Палітычная стачка эгіпэцкага пралетарыяту ўзьнімае мнімую «барацьбу» за «канстытуцыю» на ўзровень баявога антыімпэрыялістычнага выступленьня. (ТАСС)

Крывавая расправа румынскіх жандараў

ВЕНА. З Бухарэсту паведамляюць, што ў вёсках Даўхнэ Бестамо выбухнуў стыхійны рух сялян супроць непамернага падатковага цяжару. Сяляне напалі на жандараў з віламі і косамі. Разьюшаныя жандары пачалі шаблямі рубіць сялян і сялянак. Многія сялянкі цяжка паранены. Праведзены таксама шматлікія арышты. (ТАСС).

Агляд друку

Падпольны рэвалюцыйны друк у Польшчы

Ва ўмовах глыбокага падпольля, ва ўмовах жорсткага фашысцкага тэрору, калі толькі адна прыналежнасьць да кампартыі каравецца 10-12 гадамі катаргі, вялізарную ролю адыгрывае нелегальны партыйны друк. У Заходняй Беларусі, дзе фашысцкі акупант задушыў усю радыкальную прэсу, важнасьць і незаменнасьць нелегальнага друку выпукляецца асабліва моцна, асабліва ярка. Ён зьяўляецца, з аднаго боку, масавым правадніком рэвалюцыйнай ідэалёгіі, рэвалюцыйных лёзунгаў кампартыі сярод самых найшырэйшых пластоў рабочай клясы і працоўнага сялянства; з другога боку, нелегальны друк выконвае ролю магутнага арганізатара і мабілізуе працоўныя масы ва ўсіх кампаніях, якія разгортваюцца кампартыяй супроць фашысцкай дыктатуры.

Роля нелегальнага друку, як аднэй з найбольш вострых зброй партыі, добра ўлічваецца польскімі капіталістамі і іх лёкаямі сацыял- і нацыянал-фашыстамі. Увесь прадажны друк гэтых абаронцаў гінучага ладу і іх гаспадароў, захлёбваецца радасным выцьцём, калі ахранцы ўдаецца выкрыць склад партыйнай літаратуры, або якую-небудзь друкарскую ўстаноўку. Нядзіўна таксама, што фашысцкая дэфэнзыва перш за ўсё стараецца зруйнаваць тэхнічны апарат партыі.

Ня гледзячы на найвялікшыя труднасьці, ня гледзячы на жорсткі тэрор, нелегальны друк КПП узрастае вельмі шпарка і ў колькасных і ў якасных адносінах.

Кампартыя Польшчы выпускае значную колькасьць адозваў, лістовак і папулярных брашур на польскай, беларускай, яўрэйскай, літоўскай і нямецкай мовах.

Усе гэтыя адозвы і лістоўкі кампартыі, поўныя рэвалюцыйнага закліку да барацьбы з фашысцкай дыктатурай, чытаюцца з найвялікшым захапленьнем самымі шырокімі працоўнымі масамі.

Да 1-га мая КПП выпусьціла адозву да працоўнага насельніцтва: да рабочых, сялян, працоўных жанчын і салдат. У сваёй адозве ЦК КПП, характарызуючы працэс эканамічнага развалу Польшчы, які ўсё больш і больш паглыбляецца, а таксама надзвычайнае абвастрэньне наступленьня капіталістаў і памешчыкаў на жыцьцёвыя ўмовы рабочае клясы і эксплёватаванага сялянства, заклікае ўсе працоўныя масы Польшчы «да масавых палітычных забастовак і рэвалюцыйных дэманстрацый 1-га мая пад лёзунгамі барацьбы з наступленьнем капіталу і фашысцкай дыктатурай, у абарону Савецкага Саюзу».

Орган ЦК КПП «Чырвоны штандар» зьяўляецца адным з папулярнейшых выданьняў сярод рабочых і працоўных сялян. Ён чытаецца з роўнай зацікаўленасьцю і ў буйных фабрычных цэнтрах і ў глухіх сялянскіх вёсках. У проста і лёгка паданых, даступных разуменьню кожнага рабочага артыкулах, «Чырвоны штандар» ставіць перад рабочым і селянінам рад важнейшых праблем рэвалюцыйнага руху. У артыкулах чырвонай ніткай праходзіць барацьба з ППС, Бундам і інш. сацыял-фашысцкімі партыямі і выкрыцьцё іх, як праваднікоў фашысцкай палітыкі сярод рабочае клясы. «Чырвоны штандар» паказвае прадоўны Польшчы шлях рэвалюцыйнага змаганьня, шлях змаганьня за дыктатуру пралетарыяту, за польскую савецкую рэспубліку, як адзіны магчымы шлях вызваленьня з-пад уціску капіталістычна-памешчыцкай эксплёватацыі і фашысцкага тэрору.

Адным з важнейшых месц у гэтым баявым органе займае барацьба з інтэрвэнцыяй, якая падрыхтоўваецца міжнароднымі драпежнікамі і польскім імпэрыялізмам.

З бязьлітаснай яснасьцю выкрыты ўсе этапы згоды пілсудчыны з украінскімі і беларускімі нацфашыстамі, згоды, якая мела мэтай агульнае аб'яднаньне беларускай, украінскай і польскай буржуазіі для задушэньня рэвалюцыйнага руху і падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР.

Надаючы вялізарнае значэньне работе сярод армії, кампартыя выдае літаратуру, спэцыяльна прысьвечаную салдатам. «Казарма» і «Голас прызыўніка» там, куды яны трапляюць, робіцца любімымі газэтамі салдат. Арганізуючы салдацкую масу на барацьбу за штодзенныя патрэбы, супроць дзікіх зьдзекаў афіцэрыншчыны, «Казарма» і «Голас прызыўніка» папулярнай народнай мовай пашыраюць у армії лёзунгі кампартыі і Камінтэрну, выкрываючы падрыхтоўку польскага фашызму да новага паходу на Кіеў і Менск і заклікаюць усіх салдат на абарону Савецкага Саюзу.

Для сялян выдаецца пэрыядычны орган пад назвай «Грамада». «Грамада» мабілізуе працоўнае сялянства на барацьбу з фашысцкай камасацыяй (прымусовая хутарызацыя), з цяжкасьцю падатковага прэсу, з шарваркамі (прыгонніцкая праца на пабудове мастоў, шосаў і г. д.). «Грамада» папулярызуе сярод сялянства дасягненьні Савецкага Саюзу, правільна асьвятляючы сутнасьць і перавагі калектывізацыі, абвяргаючы ўсю наглую хлусьню, якую распаўсюджваюць аб СССР аб'яднаны лятер фашызму, сацыял і нацыянал фашызму.

У апошні час пачалі ўсё больш часта выходзіць фабрычна-заводзкія газэты. Перад 1-м мая ў буйнейшых заводах Варшавы, як «Паравоз», «Лільпоп» у лодзінскіх тэкстыльных фабрыках, а таксама ў капальнях Дамброўскага басэйна выйшлі спэцыяльныя першамайскія нумары.

Сярод выданьняў кампартыі Заходняй Беларусі на першым месцы вызначаюцца: «Чырвоны Сьцяг», «До волі», «Бальшавік», «Малады камуніст», якія друкуюцца на беларускай, польскай, яўрэйскай мовах.

На старонках свайго друку гэрачны КПЗ

УСЯ ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, УСЯ ПРАЛЕТАРСКАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ

павінна прыняць актыўны ўдзел у месячніку друку

Пад знакам ажыццяўлення пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабселькораўскім руху, узмоцненай барацьбы з прарывамі, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за пашырэньне калгаснага будаўніцтва і пасеўнай плошчы, за павялічэньне радоў ударнікаў-рабселькораў, за канкрэтную дапамогу нізавым газэтам і замежнаму пралетарскаму друку—праходзіць падрыхтоўка да месячніка друку і ўсебеларускага зьезду рабселькораў

Усе прадпрыемствы, калгасы і саўгасы, усе газэты, пачынаючы ад цэнтральных і канчаючы насьценнымі, павінны ўключыцца ў гэту масавую палітычную кампанію

ЗА БАЛЬШАВІЦКІ РАЗМАХ

У радзе сваіх агульных пастаноў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б асабліваю увагу заваструе на пытаньнях далейшага ўзмацненьня рабселькораўскага руху, нізавога друку і ўзмацненьня сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва ім.

Праз два дні—20 мая,—пачынаецца ўсебеларускі МЕСЯЧНІК пралетарскага друку.

НЕАБХОДНА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКІ РАЗМАХ, БАЛЬШАВІЦКУЮ ІНІЦЫЯТЫЎНАСЬЦЬ І МАСАВАСЬЦЬ, ЯК У ПАДРЫХТОЎЦЫ, ТАК І Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ МЕСЯЧНІКА ДРУКУ.

Трэба НА СПРАВЕ разгарнуць месячнік так, каб у выкананьні асноўных задач месячніка, якія вызначаны ў спэцыяльнай пастанове Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, была ўцягнута УСЯ партыйная арганізацыя, уся пралетарская грамадзкасьць Савецкай Беларусі.

Яркі прыклад сапраўднай бальшавіцкай апэрацыйнасьці далі менскія ўдарнікі друку, якія на пастанову ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і на пастановы ЦК КП(б)Б аб друку адказалі лістом, у якім высунулі 15 канкрэтных, каштоўных прапаноў (ліст надрукаваны ў цэнтральных газэтах БССР ад 6 мая):

Яркі прыклад сапраўднай бальшавіцкай апэрацыйнасьці, памножаны на арганізатарскі - масавую работу ў друку, даюць рабочыя ўдарнікі прадпрыемстваў Віцебску, Гомелю, Бабруйску, якія адгукнуліся на пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б хвалею мітынгаў, дзе прынята рад канкрэтных самаабавязацельстваў.

Неабходна, каб ня было ніводнай фабрыкі, заводу, ніводнага калгасу, саўгасу і МТС, якія-б не адгукнуліся канкрэтнымі самаабавязацельствамі ў адказ на пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб друку.

Гэты «ЖАЛЕЗНЫ ФОНД» самаабавязацельстваў у справе яшчэ большага ўзмацненьня пралетарскага друку—«самай моцнай, самай вострай зброі партыі» (Сталін) — павінен папаўнялцца далейшай магутнай хваляй сустрэчных самаабавязацельстваў.

Усю работу па падрыхтоўцы да надыходзячага ўсебеларускага зьезду рабселькораў і месячніка друку, неабходна ЦЭМЭНТАВАЦЬ самай жорсткай і пасьлядоўнай праверкай выкананьня таго, як ажыццяўляюцца пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і пастановы ЦК КП(б)Б аб друку, ЦЭМЭНТАВАЦЬ сыстэматычнай, масавай праверкай выкананьня усіх прынятых і прыманых, у зьвязку з месячнікам друку і лістом менскіх ударнікаў, самаабавязацельстваў.

Мы супроць таго, каб прыманыя пастановы і самаабавязацельствы заставаліся толькі прыгожым гэстам, заставаліся барабанным боем.

— ...Стварыць у кожным цэху, калгасе, саўгасе і МТС, населеным пункце насьценную газэту, пры абавязковай умове забесьпячэньня партыйнага кіраўніцтва імі;

...змагацца за ДЗЕЙСНАСЬЦЬ кожнага зьмешчанага на старонках газэты допісу, яшчэ больш разгортваючы пралетарскую самакрытыку;

— ...штодзенна дапамагаць нозаму маладому атраду бальшавіцкага друку — сьценным газэтам і шклографічным шматтыражкам;

— ...зараз-жа распачаць падбор лепшых рэбселькораў-ударнікаў у газэтных аддзяленьні Камвузу імя Леніна, усебеларускай Савпартшколы, усебеларускага політасьветтэхнікуму і газэтна-выдавецкае аддзяленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту;

— ...шырока папулярызаваць і змагацца за ажыццяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабселькораўскім руху, аб сельскім раённым і нізавым друку, аб друку на мовах нацыянальнасьцяй, за ажыццяўленьне 15 прапаноў менскіх ударнікаў друку;

— ...яшчэ вышэй узьняць ролю пралетарскага друку ў барацьбе за прамфінпляк, у барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады—

вось тая вялізарнейшая МАСАВАЯ работа, якую неабходна асабліва шырока разгарнуць у часе месячніка друку.

МЕСЯЧНІК ДРУКУ ПАВІНЕН АДЧУВАЦЦА ЛЯ КОЖНАГА ВАРШТАТУ, ЛЯ КОЖНАГА ТРАКТАРА, У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ.

Пад кіраўніцтвам і на чале з партыйнай арганізацыяй па-бальшавіцку правядзем месячнік пралетарскага друку!

Новымі калгасамі, перавыкананьнем прамфінпляну і павялічэньнем пасеўнай плошчы, тысячамі і дзесяткамі тысяч новых рабселькораў - ударнікаў, сотнямі і тысячамі новых насьценных газэт, яшчэ большым павышэньнем ролі друку, як калектыўнага агітатара, прапагандыста і арганізатара—адзначым месячнік пралетарскага друку.

„Ленінскі шлях"—калектыўны рабселькору-дарнік „Зьвязды"

Рэдакцыя газэты «Ленінскі Шлях» прымае выклік менскіх ударнікаў друку і па зьразе «Калгасьніка Беларусі» ўключаецца ў сацспаборніцтва па ажыццяўленьні 15 прапаноў менскіх ударнікаў друку.

Практычна мы абавязваемся правесьці ў жыцьцё наступнае:

1) Стварыць пры рэдакцыі гурток для пралаўнікоў рэдакцыі і рабселькораў—ударнікаў па вывучэньні матар'ялаў Леніна і Сталіна і партыйных пастаноў у друку.

2) 20-га мая—у дзень пачатку месячніка друку—суботна з рабочымі друкарні правесьці суботнік у карысьць дапамогі нізавому друку. Разгарнуць шырокую работу сярод прадпрыемстваў гораду, саўгасаў і калгасаў аб правядзеньні на працягу мая такога-ж суботніка (адпрацаваць некалькі гадзін) на карысьць нізавога друку.

3) На працягу месячніка друку правесьці каротнатэрміновыя курсы—канфэрэнцыі, на якіх падрыхтаваць на менш 25 рэдактароў насьценгазэт для саўгасаў, калгасаў і прадпрыемстваў.

4) Падрыхтаваць аднаго лепшага рабкора-ўдарніка для работы ў раённай газэце.

5) Сіламі сваёй друкарні падрыхтаваць трох наборшчыкаў для друкарань нованаргранізаваных раённых газэт.

6) У 2-х саўгасах раёну і 2 калгасах правесьці работу на засеве вышэйпляну ў фонд нізавога друку.

7) Узяць шэфства над шматтыражкай МТС і насьценгазэтамі аднаго прадпрыемства, аднаго буйнога калгасу і аднаго саўгасу, сыстэматычна аказваючы ім дапамогу.

8) Правесьці масавы прызыў ударнікаў друку і заварбаваць на працягу месячніка ня менш 30 ударнікаў «Ленінскага шляху».

9) Стаць рэгулярным калектыўным рабселькорам-ударнікам газэты «Зьвязда».

РЭДАКЦЫЯ «Л.Ш.»

Самаабавязацельствы газ. „Акцябр"

У адказ на заклік менскіх ударнікаў друку газэта «Акцябр» узяла на сябе наступныя абавязацельствы:

1) Забясьпечыць сыстэматычна літаратурай сваіх ударнікаў-рабселькораў, каб яны мелі магчымасьць вывучаць ленінскія творы, творы Сталіна і пастановы партыі аб бальшавіцкім друку і сацыялістычным будаўніцтве.

2) Стварыць тры новыя рабкораўскія семінары - школы, кожная на 20-30 рабкораў у Мейску, Бабруйску і Віцебску. Забясьпечыць гэтыя семінары кіраўніцтвам, а таксама даваць ім час ад часу праграмнікоў з рэдакцыі. Адначасова замацаваць існуючыя тры семінары: пры рэдакцыі «Акцябр», пры швейнай фабрыцы «Настрычнік» і Менскай семпрамкавэрацыі.

3) Арганізаваць пры рэдакцыі «Акцябр» пісьмовую кансультацыю для ўдарнікаў - рабкораў газэты «Акцябр» і для калгасьнікаў-селькораў па пытаньні вўпладзеньня тэхнікай пісаньня карэспандэнцыі, павышэньня якасьці карэспандаваньня і г. д.

4) Уключыць у сацдагавор, які павінен у бліжэйшыя дні заключацца паміж рэдакцыяй Акцябр» і Харкаўскай газэтай «Штэрн», спэцыяльныя пункты аб падрыхтоўцы кадраў газэтных працаўнікоў і аб дапамозе рабселькорам у іх рабоце.

5) Устанавіць моцную сувязь з рэдакцыямі амэрыканскіх камуністычных яўрэйскіх газэт: «Фрайгайт», арґентынскай «Ройтэр штэрн», Канадакай — «Камф» і Парыскай—«Эмэс» і праз гэтыя газэты ўстанавіць моцную сувязь і інтэрнацыянальную дапамогу паміж ударнікамі-рабкорамі газэты «Актябр» і рабкораўскімі масамі і рабочымі буйных прадпрыемстваў у капіталістычных краінах. Пачаць збор у фонд «рабочая капейка—для рабочай прэсы».

Апрача таго на агульным адкрытым сходзе газэты партячэйкі было пастаноўлена: правесьці суботнік і заработак яго аддаць у фонд дапамогі нізавому друку; пачаць на старонках газэты прапаганду за тое, каб саўгасы і калгасы пасеялі гэктары друку; зьвярнуцца ў рэдакцыю харкаўскай газэты «Штэрн» і маскоўскай газэты «Эмэс», каб яны дапамагалі нізавому друку яўрэйскім шрыфтом.

Абавязацельствы, якія на сябе ўзяў «Акцябр», вымагаюць ад работнікаў газэты больш напружанай, сапраўды бальшавіцкай працы, ажыццяў тых недахопаў, якія ёсьць пакуль што ў рабоце.

У месячнік друку рэдакцыя паставіла перад сабой задачу — павялічыць тыраж газэты «Акцябр» да 20 тыс. экз. У дапамогу газэце павінны прыйсьці рабкоры, культурныя працаўнікі, актыўныя чытачы.

«Акцябр» пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б выканае тыя вялікія задачы, якія перад ім паставіла камуністычная партыя.

На Віцебскім вузьле

падрыхтоўка да месячніка друку

увязваецца з барацьбой за ліквідацыю прарываў, з разгортваньнем ударніцтва

Шырока разгарнулася падрыхтоўка да месячніка друку на Віцебскім чыгуначным вузьле. Па ініцыятыве рэдакцыі шматтыражкі «Молат» арганізаваны 28 ударных рабкораўскіх брыгад і 14 паравозаў абвешчаны ударнымі. Гэтыя паравозы атрымалі назвы газэт і абслугоўваюцца 84 ударнікамі-рабкорамі.

У дзень сьвяткаваньня 19-й годзьдзя ЦО «Правда» брыгада паравозу С-53 абвясьціла свой паравоз ударна-рабкораўскім імя «Зьвязды». Паравоз гэты аўзяляецца адным з прыкладных, бо ні разу ня мог затрыманьня ў дарозе па віне брыгады.

11-га мая адбыліся мітынгі рабочых чыгуначнікаў, дзе выступаў прадстаўнік газ. «Зьвязда» і «Рабселькор». Рабочыя прынялі рад канкрэтных самаабавязацельстваў у адказ на ліст менскіх ударнікаў друку.

Уся падрыхтоўчая работа праводзілася пад кутом барацьбы за ліквідацыю прарываў на вузьле. Рабочыя ўключыліся ва Ўсесаюзны конкурс на лепшае дэпо і станцыю.

Ударны-рабкораўскі паравоз імя газ. „Зьвязда"

Задачы трэцяга рашаючага году пяцігодкі яшчэ больш павышаюць ролю друку ў барацьбе за генэральную лінію партыі і патрабуюць згуртаваньня радоў ударнікаў-рабкораў вакол камуністычнай партыі.

Мы, ударная брыгада паравозу С-53, у сувязі з месячнікам друку АБВЯШЧАЕМ СВОЙ ПАРАВОЗ УДАРНЫМ - РАБКОРАЎСКІМ ІМЯ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА»

Для апраўданьня гэтай назвы мы бярэм наступныя канкрэтныя абавязкі:

1) Дробны рамонт паравозу выконваць самім.

2) Дабіцца найбольшага прабегу паравоза.

3) Ніводнага затрыманьня паравоза і цягніка па віне брыгады.

Газэту «Зьвязда» просім трымаць з намі сувязь, як з рабкораўскім ударным пастом. Аб усіх недахопах і посьпехах будзем пісаць у «Зьвязду» і шматтыражку «Молат».

Брыгада ўдарнікаў рабкораў: ФІЛОНАЎ, БРЭНЧ, ШАЛЫГА, ЗУБРЫЦКІ, СОРАК.

„Барацьбіт за калектывізацыю"

у дапамогу нізавому друку

На заклік менскіх ударнікаў друку рэдакцыя Плешчаніцкай раённай газэты «Барацьбіт за калектывізацыю» бярэ на сябе наступныя абавязкі:

У часе месячніка друку (з 20 мая да 20 чэрвеня) правесьці каротнатэрміновыя курсы рабселькораў.

Дабіцца пасеву на раёне звыш пляну 10 га у карысьць нізавога друку і арганізаваць суботнік з гэтай мэтай.

Для пастаяннага кіраўніцтва газэтамі охвяцаных калгасаў і саўгасаў раёну на ўвесь час прымацаваць наступных работнікаў рэдакцыі: Бутэгін—калгас «1 мая», Гэльфман — калгас імя АДПУ 1 Міхайлаў — саўгас «Замешша».

У часе месячніка арганізаваць 2 выязныя рэдакцыі ў буйнейшыя калгасы.

17 мая склікаць вялёт рабселькораў раёну па пытаньнях месячніка друку і другой бальшавіцкай сяўбы. Абгаварыць на зьлёце ліст менскіх ударнікаў друку.

Адказны рэдактар Бутэлін.

Інструктар па масав. рабоце Міхайлаў.

Май і чэрвень—месяцы штурму прарываў

і прызыву ўдарнікаў друку

12-га мая на віцебскай акулярнай фабрыцы адбыўся агульны сход рабкораў-ударнікаў і рабочых, які заслухаў даклад прадстаўніка газэты «Зьвязда» і «Рабселькор» аб падрыхтоўцы да месячніка друку, да Ўсебеларускага зьезду і аб лісьце менскіх ударнікаў друку.

Сход пастанавіў абвясьціць май і чэрвень месяцамі штурму прарываў і прызыву у рады ўдарнікаў друку. Па прапанове раборкі Гапубовай сход адгаласова пастанавіў аддлічаць у карысьць замежнага друку па 10 кап. штомесячна.

РАФАЗЭЛЬ.

РАБСЕЛЬКОРАЎСКІ РУХ І НІЗАВЫ ДРУК ГОМЕЛЬШЧЫНЫ НА УЗДЫМЕ

Рост рабселькораў і фабрычна-заводзкага друку

На 1 мая 1931 г. па Гомелі і прыгарадным раёне лічыцца 4.079 рабселькораў. У параўнаньні з 1929 г. колькасьць рабкораў павялічылася на 3.132, ня ўлічваючы колькасьці насьценкораў.

Насьценных газэт ёсьць 200. Асабліва хутка расьце іх лік за апошні час. На некаторых прадпрыемствах рост гэты даўдаў 30-90 проц. Насьценгазэты стараюцца на вучастках («Каміцтэрн»), па зьменах («Каппраца»), па брыгадах і г. д.

Друкаваных газэт налічваецца 14, з іх 3 вайсковыя. Рост шматтыражак па прадпрыемствах іншы такім парадкам: 1926 г.—1; 1927—2; 1928—3; 1929—8; 1930—9; 1931—11. Такая шматтыражка, як «Сельмашэц», выходзіць амаль 4 разы ў месяц.

Рабкоры—арганізатары мас

Рабселькор становіцца арганізатарам мас у барацьбе за генэральную лінію партыі. Ён сам становіцца прыкладам сваёй працаю ў барацьбе за прамфінпляк, за новыя вышэйшыя формы і мэтады камуністычнай працы на прадпрыемстве і ў калгасе. Вось прыклады.

Рабкоры зав. «Пралетары», абгаворваючы высунуты рабочымі сустрэчны прамфінплян на 5.500.000 руб., у сувязьляна выпушчаных пістоўках даказалі магчымасьць павялічыць яго да 5.800.000 (павялічэньне на 6,9 проц.). Высунуты рабкорамі дадатковы сустрэчны быў прыняты. Пры непасрэдным іх (рабкораў) удзеле была створана першая ў БССР «сквозная» брыгада па растворамяшалках, якая на хадайніцтве «Палескай Праўды» атрымала ад ураду БССР ордэн працоўнага чырвонага сьцягу.

Рабкоры заводу «Пралетары» (Рабіновіч, Вязуеўскі, Хаўкін М., Ярмоленка і Атрошчанка) унеслі прапановы, якія далі эканомію прадпрыемству на 38.760 рублёў. Прапанова Рабіновіча, якая дала эканомію ў 33.000 руб., уносіла цэлую рэвалюцыю ў выраб растворамяшалак. Трэст паслаў яго на вучобу як лепшага вынаходцу.

Усіх прыкладаў не пералічыць. Яны гавораць аб тым, што рабкор стаў сапраўдным арганізатарам мас у барацьбе за лінію партыі, паказваючы калі самага варштату прыклады сваёй работы.

Новыя формы і мэтады работы

Новыя формы і мэтады масава-арганізацыйнай работы (рэйды, ударныя брыгады друку, грамадзкі буксір і г. д.) усё больш і больш становяцца неадлучнай працай друку, чым канчаткова адкідаецца арыентацыя на самацёк.

«Палеская праўда» і нізавы друк ужо маюць вялікі вопыт апэрацыйна-масавай работы ў барацьбе за прамфінпляк.

Насьценгазэты на Сельмашы практыкуюць выпуск плякатаў, штодзённых штурмовак, «сыгналаў», «трывогі» і г. д.

У чым сутнасьць «сыгналаў»? Падамо адзін маленькі штрышок. У цэху не хапала валаў. Насьценгазэта вывешвае вялікі плякат: «Праз гадзіну спыніцца работа, калі ня будзе вала. Майстар Агранат, прыми меры»... Зараз-жа майстар пасьпяшаўся ліквідаваць недахоп.

На фабрыцы «Вззуві» ў часе штурму за зьняцьце фабрыкі з чорнай дошкі ў цэхах былі арганізаваны «штодзённыя штурмавыя газэты».

«Ратацыя» і «Сельмашэц» у часе прарыву па падпісцы на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» разам з парткалектывам правялі вялізарную работу і дабіліся 100-процантнай падпіскі на пазыку.

Такі каштоўны вопыт, як склікальне першай канфэрэнцыі ліцейшчыкаў, зьяўляецца вынікам прапановы заводзкай газэты «Чырвоная вагранка».

Арганізаваны ў «Палескай праўдзе» сэктар рабселькораў і ўдарных брыгад, які ўзяўся за ўкараненьне вопыту брыгад «Правды», ужо за месяц правёў больш 20 рэйдаў па розных пытаньнях. У рэйды ўцягваліся выключна лепшыя рабочыя-ўдарнікі. Такіяж рэйды (іх было 6) праведзены ў Добрушы. Якасьць матар'ялу брыгад вельмі высокая.

Аб старых адрыжках

Разам з ростам рабселькораў, як арганізатараў мас у барацьбе за лінію партыі, сярод некаторай часткі рабкораў (большасьць іх служачыя) усё яшчэ існуе нежаданьне зразумець новыя формы працы рабселькора, як арганізатара, нежаданьне прыстасавацца да агульных задач партыі, а самае галоўнае—нежаданьне падпарадкавацца партыйнаму кіраўніцтву, асабліва кіраўніцтву нізавых партячэек. Гэта азначае—прыпісваціць сябе мясцовай партыйнай арганізацыі. Нават адзін стары рабкор, член партыі, горача пярэчыў пастанове партыі перадаць справу заціску самакрытыкі аднаго рабкора ў гарком і гарКК, не давяраючы парткіраўніцтву, разглядаць гэту справу.

На Добрускай фабрыцы рэдкалегія выдаліла сакратара партячэйкі з пасяджэньня рэдкалегіі, баючыся, што ён... выкрые рабкораў.

Рабкор з установы, якога перакінулі ў другое месца для ліквідацыі прарыву, прышлё скардзіцца ў рэдакцыю, што калі яго перакінуць, дык яго ўстанова выпадзе з поля зроку рабкораўскай арганізацыі (?), бо ва ўстанове такіх рабкораў, як ён, няма...

Усе гэтыя прыклады выразна гавораць аб тым, што неабходна разгарнуць шырокую растлумачальную і палітычна-выхаваўчую працу аб перабудове рабселькораўскай работы ўсімі без выключэньня рабкорамі.

Парткіраўніцтва

Парткіраўніцтва рабкораўскім рухам і нізавым друкам на некаторых прадпрыемствах значна палепшылася. Амаль ўсе рэдактары шматтыражак зьяўляюцца членамі бюро парткалектываў. Заслухоўваньне і дакладаў на пасяджэньнях увайшло ў сыстэму, а таксама на пасяджэньнях парткалектываў стаўніца асноўнымі пытаньні аб працы шматтыражкі і насьценных газэт.

Партком заводу імя Ланцуцкага ставіў арганізаваць (і ўжо праводзіць) конкурс на лепшую насьценную газэту і на лепшае кіраўніцтва імі з боку партыйных ячэек. Гэта кампанія дае сваё дадатнія вынікі.

Насьценныя газэты ў цэхах перадоўваюць сваю работу і становяцца ім памочнікамі партыйных ячэек (электрастанцыя і г. д.). На фабрыцы «Вззуві» скліканы сход парткалектыву сумесна з рабкорамі, дзе стаяла пытаньне аб стаповішчы рабкораўскага руху і перадачы барчай кампаніі нізавога друку.

Гарком КП(б)Б склікаў сход парткалектыву, дзе паставіў даклад аб усесаюзнай нарадзе па рабселькораўскіх пытаньнях, а таксама заслухаў даклад рэдактара «Палескай Праўды» аб становішчы нізавога друку і рабкораўскага руху.

Але ўсё-ж парткіраўніцтва з боку ячэек на сёньняшні дзень недыстрэнгальна асабліва фабрычна-заводзкім друкам, насьценнымі газэтамі. Часта склад рэдкалегіі не забясьпечваецца лепшымі камуністамі і рабочымі-ударнікамі, якія на справе змагалі праводзіць генэральную лінію партыі. І вось вынік. На заводзе «Сацыялізм» насьценгазэта стала абмяжоўваць працаўчы, якія арганізавана не таксама выйсьці на работу таму, што ім павысілі расцэнак. На чыгунцы склад рэдкалегій насьценных газэт не забясьпечан прадаадольнымі работнікамі і г. д. мала рабочых-ударнікаў.

Шматтыражка «Чырвоны цягнік» (г. по Гомель-тасп.) увесь час толькі займалася выкрываньнем «гноўнікаў», а не чыгуны добрых прыкладаў і ўдзелу рабочых-ударнікаў па чыгунцы.

У Добрушы з-за адсутнасьці кіраўніцтва распалася 8 рэдкалегій насьценных газэт.

* * *

Узмацненьне парткіраўніцтва друку і рабселькораўскім рухам, перабудова рабселькораўскай работы, шырокае ўкараненьне мэтадаў ударных брыгад, рэйдаў, грамадзкага буксіру, перакліч і г. д.—лепшы сродак яшчэ большага павышэньня ролі друку і рабселькораў як актыўных правадніков генэральнай лініі партыі. Мы ў Гомелі маем значныя дасягненьні ў гэтым сэнсе, але яшчэ многа трэба зрабіць і газэтам, і парткіраўніцтвам, каб дабіцца большага, каб дырэктывы ЦК УсеКП(б) былі ажыцьцёлены поўнасьцю.

КАЛАМІЕЦ.

Мабілізаваліся на барацьбу з прарывамі

Старшыня фабкому «Дзьвіны» Гаварэц Марыля адкрыла агульны сход рабочых фабрыкі. На парадку дня адно пытаньне: даклад прадстаўніка «Зьвязды» і «Рабселькора» аб месячніку друку.

У спрэчках па дакладу рабочыя-ўдарнікі патрабавалі адказаць на ліст менскіх ударнікаў друку канкрэтным удзелам у барацьбе за ліквідацыю прарываў.

Старая работніца, якая працуе на фабрыцы з 1903 г., якая добра яшчэ памятае ўмовы работы на фабрыцы ў часе царызму, калі рабочы ня меў права выказаць свае думкі, зараз заклікае рабочых і работніц фабрыкі прыняць актыўны ўдзел у рабоце насьценных цэхавых газэт і шматтыражкі, змагацца за ўдарніцкі рух.

Сход абавязаўся арганізаваць суботнік у дапамогу нізавому друку, адлічваць штомесячна міжнародны пітак на карысьць замежнага пралетарскага друзьты ў падшэфных калгасах і г. д.

Адразу пасьля сходу была падана заява ад 10 рабочых ільнабазы пры фабрыцы «Дзьвіна» наступнага зместу:

«Мы, ніжэйпадпісаныя рабочыя ільнабазы, арганізуючы вытворчую кампанію, бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1) Свалачасова выгружаць і грузіць вагоны, ліквідаваць прастой.

2) Акуратна вытвараць укладку льну па гатунках.

3) Рашучымі мерамі вынішчыць прагулы, якія ёсьць і ўшчыльніць рабочы дзень. Для гэтага абавязаемся кідаць на работу да пачатку гудка і ліквідаць работы раней установленага часу. Акрамя гэтага, абавязуемся актыўна наведваць усе сходы, прымаць удзел ва ўсіх правадзімых кампаніях, а таксама ў правядзеньні культурна-асьветных работы.

Падрыхтоўка да месячніку друку і да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў разгортваецца пад кутом заклікаў лепшых рабочых у рады ўдарнікаў друку, выкананьня задач трэцяга рашаючага году.

Кандаўская, Камноў, Клюшкін, Постан, Тлашч, Аненка, Лукаш, Лейміт, Елеевіч і Лускоў.

„Фабрыка стане ўдарна-рабкораўскай"

На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск) — мітынг рабочых, прысьвечаны падрыхтоўцы да месячніка друку і да Ўсебеларускага зьезду рабкораў.

Рубільнік выключан, маторы спынілі рух. Прадстаўнік газэт «Зьвязда» і «Рабселькор» атрымаў слова. Уважліва слухаюць.

Адказ рабочых кароткі: узяць канкрэтныя самаабавязацельствы, падмацаваць бальшавіцкім тэмпы работы на фабрыцы:

— Арганізаваць суботнік на карысьць нізавога друку. Дабіцца ежы, каб брыгада спала ўдарна-рабкораўская. Дакладаць збор грашыны да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў і інш.

Водгукі на ліст менскіх ударнікаў друку

Студэнты індустрыяльна-пэдагагічнага інстытуту (гор. Віцебск), абгаварыўшы ліст менскіх ударнікаў друку, самаабавязаліся палепшыць работу насьценнай газэты інстытуту, арганізаваць ударныя брыгады студкораў на дапамозе нізавому друку, дапамагчы падпісфнаму калгасу ў наладжаньні ў ты насьценгазэт і інш..

Агульны сход кансэрвацыі — ніц панчошнай фабрыкі заслухаў фармацыю аб падрыхтоўцы да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў, абвесьціў прыняў ва ўдарныя рады рабкораў.

Кулацкі агент—на пасадзе каморніка

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). У Вушацкі раён надаўна прыехаў госьць Баранаў, адрэкамандаваўшы сябе каморнікам. Вушацкі райвыканком прыняў Баранаў на службу, хоць меў на руках паперу аб тым, што Баранаў выключан з Горацкай с.-г. акадэміі за антысаміцызм.

Новы каморнік пачаў праводзіць у раёне яўна кулацкую лінію. Калі яго пасалі ў калгас «Чырвоны сорабець» працаваць на ўладкаваньне, дык ён, выкарыстаўшы малапісьменнасьць і пяводкультасьць старшыні праўленьня, адвёў калгасу малапрыгодную для скарыстаньня зямлю, а кулацка-заможным гаспадаркам адвёў лепшыя вучастку. Калі калгасьнікі пачалі пярэчыць, ён пагразіў гнаць іх, «Таму ўстановы тыі і ўраду. Я ня маю права ім інакш».

Такую зьяву пачулі калгасьнікі і адказ на скаргі—чаму Баранаў адмовіся ідзьесьці напарны ліяй 28 ўстаноўным у калгас гаспадаркам. Для ліквідаваньня становішча прыйшлося ў калгас «Чырвоны сорабець» дакаморніка. Выгад адзін—кулацкі агент месца на даве падкулачыць на пасадзе каморніка.

Б. Ліцкіна і Я. Гінзбурга

Рэйд ударнай брыгады „Зьвязды"

Завод „Полымя Рэвалюцыі"

ЗРЫВАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА РАМОНЦЕ ВАГОНАЎ

Завод—без прамфінпляну. Спаборніцтва і ўдарніцтва—без кіраўніцтва

Заводзкія арганізацыі павінны неадкладна перабудавацца. Мабілізаваць рабочых заводу вакол задач сваячасовага і добраякаснага рамонту вагонаў

У мінулым годзе завод «Полымя рэвалюцыі», перашоўшы з веданьня НКШЗ у веданьне ВСНГБ, кінуў займацца сваёй асноўнай работай—рамонтам вагонаў. Толькі з 1-га красавіка г. г. завод зноў перадан ў веданьне НКШЗ і цалкам пераведзен на абслугоўваньне патрэб чыгуначнага транспарту. Становішча транспартнай гаспадаркі патрабуе ад заводу напружаньня ўсіх сіл і магчымасьцяй для выкананьня заданьняў па рамонце вагонаў.

Без падрыхтоўкі

Брыгада «Зьвязды» паставіла сваёй мэтай праверыць, наколькі завод падрыхтаваны сустрэў пераход на новую работу, як ён перабудаваўся на-ходу, пераключыў сваю работу на выкананьне плянай вагонарамонту.

Тое, што выявіла брыгада, паказвае, што заводзкія арганізацыі ня досыць сур'ёзна падыйшлі да гэтага пытаньня, не ўявілі ўсёй адказнасьці задач, якія перад імі пастаўлены фактам пераходу на вагонарамонт. Адразу завод апынуўся ва ўмовах адсутнасьці неабходных матар'ялаў і інструментаў. Тыя інструманты, якія былі на заводзе да пераходу ў ведама ВСНГБ, былі даўно зданы майстэрням малога рамонту, дзе яны ў большасьці прыведзены ў негодны стан, а каб атрымаць новыя інструманты, завод не паклапаціўся. Дырэкцыя-ж дарогі, якой завод непасрэдна падпарадкаван, наогул ня цікавілася гэтым пытаньнем. Абуравюча безгаспадарчасьць была дапушчана ў мінулым годзе былым дырэктарам пры пераходзе заводу ў ведамя ВСНГБ. Ён загадаў разбурыць пліту для апальваньня бандажоў, хаця гэта зусім не выклікалася неабходнасьцю. Зараз адсутнасьць пліты зрывае працу заводу.

З гутарак брыгады з рабочымі заводу высьветлілася, што сярод іх не праведзена растлумачэньне задач заводу ў сувязі з пераходам на рамонт вагонаў.

Пачалі з прарыву

Вынікі такой дрэнай падрыхтоўкі сябе адразу паказалі. Першы месяц рамонту вагонаў даў глыбокі прарыў. Заданьне дырэкцыі дарогі па рамонце вагонаў ня выканана. У КРАСАВІКУ МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 49,8 ПРОЦ.

Характэрна адзначыць, што новы дырэктар т. АЛЕКСАН'ЯНЦ, які ўжо два месяцы працуе на заводзе, дакладна ня ведае, якое заданьне дана заводу на рамонт вагонаў. Ён, напрыклад, заявіў брыгадзе, што заводу дана заданьне адрэмантаваць 250 вагонаў на працягу ЦЭЛАГА ГОДУ, але, як высьветлілася на справе, заданьне гэта дана не на год, А НА ДРУГІ КВАРТАЛ.

Прамфінпляну цэхаў і брыгад няма. Рабочыя ня ведаюць, колькі каму трэба чаго зрабіць. Зусім відавочна, што пры такім становішчы ні аб якіх сустрэчных плянах на заводзе няма і гутаркі.

„Ёсьць спроба пераходу на гаспадарчы разрахунак"

Пытаньнем пераходу на гаспадарчы разрахунак адміністрацыя да гэтага часу не займалася. Праўда, дырэктар заводу зусім сур'ёзна яго зауважыў, што «ёсьць спроба пераходу на гаспадарчы разрахунак», але, на жаль, дырэктар ня мог сказаць, у чым канкрэтна гэта «спроба» выявілася. Ясна адно, што да пераходу на гаспадарчы разрахунак фактычна нічога ня зроблена, не гаворачы ўжо аб тым, што пытаньне гэта не прапрацавана сярод рабочых.

Перагляд норм і расцэнак яшчэ не распачаўся. Толькі зараз міркуецца прыступіць да гэтай работы. Адным, і аб гэтым рабочыя нічога ня ведаюць.

Волна жывецца працульшчыкам

Ніякіх мер культурна-выхаваўчага значэньня для ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны не праводзіцца. Працоўная дысцыпліна слабая. У КРАСАВІКУ ПРАГУЛЫ СКЛАСЬЛІ 286 ЧАЛАВЕКА-ГАДЗІН. На заводзе існуе чорная дошка для прагульшчыкаў, але на ёй ніхто не запісан. Ёсьць і таварыскія суды, але яны нікога ні судзілі.

На заводзе вялікая цякучасьць. Самазамацаваньне рабочых не праводзілася. У бягучым годзе завод павінен пашырыцца да 1.000 чал., але ніякіх мер да вярбоўкі новых рабочых ня прымаецца. Ня гледзячы на недахват кваліф'каванай рабочай сілы, на заводзе няма ніводнага гуртка па павышэньні кваліфікацыі рабочых.

Золата пад нагамі

Заводзкі двор літаральна завален маталяломам. ЧЫГУНУ І ЖАЛЕЗА РАСКІДАНА КАЛЯ 10 ВАГОНАЎ. Сярод лому шмат ГОДНЫХ падшыпнікаў, балтоў, заклёпак і інш., у якіх завод адчувае вялікую патрэбу.

Спаборніцтва—забыты вучастак

Спаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе—без кіраўніцтва. Ударнікаў лічыцца фармальна 314 з агульнага ліку 500 рабочых. Аднак, становішча з выкананьнем прамфінпляну сьведчыць, што лік іх значна меншы.

Ніякага ўліку спаборніцтва няма. Даговары ня вывешаны. Рабочыя ня ведаюць аб тых абавязках, якія яны ўзялі на сябе па дагаворах. ВЫКАНАНЬНЕ ДАГАВАРОЎ НІКІМ НЕ ПРАВЯРАЛАСЯ.

У сьнежні месяцы мінулага году ў часе кампаніі па зборы рабочых прапаноў было сабрана 130 прапаноў, З ЯКІХ ВЫКАНАНА ТОЛЬКІ 60 ПРОЦ. Стары плян рацыяналізацыі ня выканан, а новы яшчэ ня складзен. Вытворчыя нарады не праводзяцца. ЗА ЎВЕСЬ 1931 г. БЫЛА ТОЛЬКІ АДНА ВЫТВОРЧАЯ НАРАДА.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы аб эканоміі апалу, на заводзе нават НЕ ВЯДЗЕЦЦА ЎЛІКУ ВЫДАТКАВАНЬНЯ яго. Норм выдаткаваньня няма. Спаборніцтва на эканомію апалу не вядзецца.

Грамадзкае харчаваньне не наладжана

БЯЗ УЛІКУ НЯМА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ

Толькі там правільна арганізавана праца на палёх, дзе вядзецца дакладны ўлік зьдзельшчыны

Максымальна ўшчыльняючы на аснове зьдзельшчыны і спаборніцтва тэрміны сяўбы, па-бальшавіцку змагацца за перавыкананьне пасеўных плянаў

ЗАМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ

—на ўзровень тэмпаў калектывізацыі

За апошні час па БССР мы маем значны рух у справе разгортваньня калектывізацыі. На 10 мая ў калгасах БССР знаходзіцца 28,3 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак рэспублікі.

Для таго, каб з посьпехам правесьці веснавую сяўбу, неабходна максымум увагі зьвярнуць на замацаваньне калгасаў. Рад раённых арганізацый сканцентравалі сваю ўвагу толькі на колькасным росьце калгасаў, упусьціўшы арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

На сёньняшні дзень рост калгасаў апераджае іх арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне. Узяць хаця-б такія цаканальнікі, як аграмаджаньне рабочай скаціны. Так, на 11 студзеня г. г. у калгасах было 116.670 гаспадарак, а рабочай скаціны было аграмаджана толькі 88.852 штукі, т. зн. што на 1,3 гаспадаркі прыходзілася адна рабочая адзінка. На 1 мая—199.253 гаспадаркі, рабочай скаціны—132.339 штук, або на 1,6 гаспадаркі—адна рабочая адзінка. Гэтыя лічбы сьведчаць аб вялікім адставаньні тэмпаў аграмаджаньня рабочай скаціны ад тэмпаў росту калектывізацыі па БССР.

У Бярэзінскім раёне па калгасах не аграмаджана больш 300 рабочых коняй. У Заспаўскім раёне не аграмаджана больш 350 коняй. Вушацкі райкалгасаюз ня ведае, колькі на калгасах не аграмаджана рабочай і прадукцыйнай жывёлы. У раёне панае настрой, што да выхаду ў поле ня трэба аграмаджваць.

Ня лепшая справа і з аграмаджэньнем кароў. Ёсьць выпадкі неаграмаджаньня кароў на працягу году і больш (калгас імя Багінскага, «Ленінскі шлях», Бярэзінскага раёну, местачковы калгас «Бялынічы» і г. д.). У радзе месц аграмаджаньне кароў адкладваецца з вясны на восень, з восені на вясну.

Трэба памятаць, што ад своячасовага аграмаджаньня рабочай і прадукцыйнай жывёлы ў значнай меры залежыць гаспадарчая моц калгасу. Таму наша задача — зараз-жа перакалючыцца на ліквідацыю гэтага прарыву і неадкладна аграмаджаць рабочую і прадукцыйную жывёлу, інвэнтар і ўсю маемасьць, якая падлягае аграмаджаньню згодна статуту.

Мерапрыемствы па арганізацыі працы ў калгасах і пераход іх на зьдзельшчыну маюць падавычай важнае значэньне ў гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Аднак, рад раённых арганізацый і ў першую чаргу райкалгасаюзы не даацэньваюць палітычна-гаспадарчай важнасьці пераходу на зьдзельшчыну. Аб гэтым сьведчыць тое, што на 5 мая па БССР на зьдзельную сыстэму работ пераведзена толькі 4.515 калгасаў, або 67 проц. у час, як згодна дырэктыў партыі і ўраду ўсе калгасы павінны былі быць пераведзены на зьдзельшчыну не пазьней, як 15 красавіка.

Ёсьць такія выпадкі, калі зьдзельшчына ўведзена толькі на паперы, нормы выпрацоўкі не даведзены да брыгад і паасобных калгаснікаў, зьдзельныя нормы не адменены ў працадзнёх, рабочая сіла не расстаўлена па брыгадах, ліквідацыя абязьлічкі не праведзена. Слаба праведзена растлумачальная работа сярод калгаснікаў аб пераводзе на зьдзельшчыну. Калгаснікі ня ведаюць, якія работы адносяцца да лёгкіх, сярэдніх, цяжкіх і кваліфікаваных.

Слабы тэмп укараненьня зьдзельшчыны ў калгасы і факты скажэньня асноўных прынцыпаў зьдзельшчыны тлумачацца выключна правааапартуністычнымі адносінамі з боку раду райкалгасаюзаў, якія не арганізавалі належнай практычнай дапамогі калгасам у пераходзе на зьдзельшчыну.

Бязумоўна, усе гэтыя недахопы выкарыстоўвае кулак, які прымае ўсе меры для таго, каб сарваць укараненьне зьдзельшчыны ў калгасах.

Неабходна бязьлітасна ўдарыць па кулакох і іх агентах, якія пралезьлі ў калгасы і тармозяць работу па пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну. Для замацаваньня калгасаў неабходна ў штодзённай рабоце выяўляць і ачышчаць калгасы ад кулакоў і падкулачнікаў, якія пралезьлі ў калгас і перашкаджаюць іх замацаваньню.

Пры пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну трэба як можна лепш арганізаваць масы з тым, каб кожны калгаснік і калгасьніца, прыступаючы да работы, загадзя ведалі, якую норму яны абвязаны выканаць, за якую колькасьць і якасьць работы ім будзе залічан працадзень. Трэба так наладзіць улік работы, пры якім кожнаму калгаснику штодзенна павінна быць запісана колькасьць выпрацаваных ім працадзён у яго працоўную кніжку.

Вялікае значэньне ў справе гаспадарчага замацаваньня калгасаў адыгрывае своячасовае арганізацыйнае афармленьне іх. Аднак, маюць месца такія прыклады, калі калгасы не афармляюцца на працягу доўгага часу (Лепельскі і Нараўлянскі раёны). У ЛЕПЕЛЬСКІМ раёне 6 калгасаў не зарэгістраваны ні ў райвы, ні ў райкалгасаюзе. Частка з гэтых калгасаў існуе больш году. Адсутнасьць належнага кіраўніцтва з боку райкалгасаюзу і сельсаветаў прывяла да развалу ў гэтым раёне двох калгасаў. 18 новых калгасаў у НАРАЎЛЯНСКІМ раёне не афармляюцца. РЫМАВІЦКІ сельсавет Бабруйскага раёну ўпарта ня хоча афармляць калгасу ў в. Кругпаніўцы, які арганізован па ініцыятыве беднаты. У гэтым калгасе ня выбрана праўленьне, інвэнтар, цягавая сіла і насеньне не аграмаджаны. У БРАГІНСКІМ раёне не аддаецца ўвагі гаспадарчаму замацаваньню старых і новаарганізаваных калгасаў. Зацьвярдженае статуту новаарганізаваных калгасаў затрымліваецца на 2-3 месяцы.

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР ад 4 красавіка павінна быць выканана. Кожны новаарганізаваны калгас павінен быць афармлены ў прыдзеленны тэрмін. Адразу-ж пасьля афармленьня трэба неадкладна аграмадзіць сродкі вытворчасьці, рабочую і прадукцыйную жывёлу і с.-г. інвэнтар згодна статуту. Пастанову тэму райкалгасаюзы павінны безадкладна праводзіць у жыцьцё.

За несвячасовае афармленьне калгасаў, неаграмаджаньне маемасьці ў першую чаргу адказвае райкалгасаюз, які павінен такім чынам паставіць сваю работу, каб ня было ніводнага калгасу, да якога-б ня быў прымацаваны адзін з работнікаў раённых або мясцовых арганізацый, які-б практычна дапамог арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню калгасу і пераводу на зьдзельшчыну.

Рашуча разгортваючы далейшае наступленьне на кулака, барацьбу з праяўленьнямі апартунізму і стаўкай на самацёк, з «лявацкімі» заскокамі і голым адміністраваньнем у кіраўніцтве калгасамі—будзем мацаваць і пашыраць перамогу сацыялістычнага сэктару вёскі, разгортваючы суцельную калектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва як класы.

П. Скавінскі.

УСЯ ВЁСКА—У КАЛГАСЕ „ЗЬВЯЗДА“

ПОЛАЦАК. Калгас імя газэты «Зьвязда» арганізаваўся толькі ў красавіку месяцы гэтага году. У калгас увайшло 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Зараз калгас ударнымі тэмпамі прыступіў да правядзеньня бальшавіцкай сяўбы. Разгорнута масавая сяўба гароху, пшаніцы, аўса і ячменю.

Добрае правядзеньне сяўбы, дружная работа калгаснікаў выклікалі ўзмоцнены прыліў у калгасы. На сёньняшні дзень в. Раштава, дзе арганізован калгас імя «Зьвязды», ужо калектывізавана на 96 проц.

М. Яроменка.

Выканаць плян кантрактацыі сена

Паводле дырэктыў плян кантрактацыі сена павінен быць скончан да 1 мая. Між тым на 10 мая плян кантрактацыі выкананы толькі на 35,7 проц., прычым па сыстэме Белпільнасаюзу плян выкананы на 24,9 проц., а Белхлебмэсаюзам—на 44,4 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб поўным ігнараваньні раённымі арганізацыямі пытаньняў кантрактацыі сена.

Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў, райкаапсаюзы і некаторыя раённыя арганізацыі да гэтага часу нічога ня робяць для ўзмацненьня кантрактацыі сена. Так, Лельчыцкі і Гарадоцкі раёны да гэтага часу не закантрактавалі ніводнага гэктара сена.

Кантрактацыя сена ў большасьці раёнаў праходзіць самацёкам, у выніку чаго мы маем па некаторых раёнах нагебнае выкананьне пляну. Так, Бешанковіцкі раён выканаў толькі 0,4 пляну кантрактацыі сена, Борканіцкі—1,1 проц., Дрысенскі—1,7, Чашніцкі—1,9, Камарынскі—2,5, Сенненскі—2,9, Сіроцінскі—3,7 проц. і г. д.

Найбольш адстаюць ільнаводчыя раёны. Белпільнасаюз гэтай справе аддае вельмі мала ўвагі.

Такія адносіны раённых арганізацый да кантрактацыі сена ставяць пад пагрозу выкананьне важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі. Злосныя зрыўшчыкі кантрактацыі павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Трэба адзначыць, што побач з раёнамі, якія ганебна правальваюць кантрактацыю сена, некаторыя раёны перавыканалі сваё заданьне па кантрактацыі. Так, Прапойскі раён выканаў 131,6 проц. пляну кантрактацыі. Нараўлянскі—112,9 проц., Ельскі—103,3, Лоўскі—101,5 і Сьвіслацкі—103,3 проц.

Адстаючыя раёны павінны безадкладна падцягнуцца з тым, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю скончыць плян.

Жыцько.

Узаемадапамога калгасаў

БЯЛЫНІЧЫ. Калгаснікі Галаўчынскага сельсавету па-ўдарнаму спаткалі вясну. Уся работа пераведзена на зьдзельшчыну. У выніку значна ўзмацніўся прыліў у калгасы. На 1 мая ў калгасах было 260 гаспадарак, прычым за адну дэкаду ўлілося больш 50 гаспадарак. Зараз сельсавет калектывізован на 92 проц.

10-га мая калгаснікі калгасу імя «XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі» выехалі на дапамогу калгасу «Краіна Саветаў», які нядаўна арганізаваўся. За 6 гадзін калгаснікамі быў узаран увесь яравы клін у 35 гэкт. Калгас імя Войкава таксама выехаў на дапамогу новаарганізаванаму калгасу «Завет Леніна». На сходзе ячэйкі КП(б)Б калгаснікі запэўнілі, што плян сяўбы будзе выкананы своячасова.

Горшая справа з аднаасобнікамі. Пасьля правядзеньня адпаведнай растлумачальна-масавай работы аднаасобнікі толькі некалькі дзён назад выехалі ў поле.

Бядуленка.

Калгас „Взяўнічы бязбожнік“—на шляху да аздараўленьня

ВУЛА. (Па тэлеграфу. Наш кар.).

У выніку сынпалаў «Зьвязды» і прынятых мер па аздараўленьні калгасу «Взяўнічы бязбожнік» пачаўся новы прыліў беднякоў і сераднякоў у калгас. 30 гаспадарак вёскі Вусьвіцы ўступіла ў калгас.

У сваім рапарце на імя райкому КП(б)Б і райвыканкому новыя калгаснікі запэўняюць, што поўнасьцю выканаюць заданьні, ускладзеныя на іх партыяй па другой бальшавіцкай сяўбе.

К.

Зьдзельшчына дала

ўзоры сацыялістычнай калектыўнай працы

РАЎНЕНЬНЕ НА КАЛГАС „ЗЬВЯЗДА“

ВУЛА, 14. (Наш кар.).

Значны час ВУЛЬСКІ раён па калектывізацыі ня меў ніякага прыліву. Барацьба за ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы, моцны ўдар па кулацтве і яго агентуры ў радах партарганізацыі, зьмена апартуністычнага кіраўніцтва РВК і райкалгасаюзу—забясьпечылі значны пералом.

Пасьпяховы ход сяўбы выклікаў масавы прыліў і арганізацыю новых калгасаў. На 10 мая Вульчынска калектывізавана на 31,4 проц. Кожны дзень адсюль прыходзяць весткі аб арганізацыі новых калгасаў і прыліве ў старыя. На перадзе па калектывізацыі ідзе Сушанскі сельсавет, які калектывізаваны на 80,5 проц., а за ім—Сокараўскі—на 66,5 проц., Вульскі—46 проц., Заречанскі—43 проц. Вобальскі сельсавет увесь час стаяў на апошнім месцы, за час сяўбы вырас на 10 проц.

Цягнуцца ў хвасьце Баранькаўскі і Вусьвейскі сельсаветы. Першы калектывізаваны на 7,3 проц., а другі—на 12.

Прыкладнай і ўдарнай працай у часе сяўбы, папярэдняй падрыхтаванасьцю і арганізаванай працай на полі на аснове зьдзельшчыны, вызначаюцца такія калгасы, як «Зьвязда», «Камунар»; у апошні ў часе сяўбы ўступіла 67 гаспадарак, у «Чырвоным Кугоні» ўступіла 35 гаспадарак, «Взяўнічы бязбожнік»—30 гаспадарак, «Чырвонае Баброва»—22, «Ленінскі шлях»—20 і г. д.

Аднак, на дасягнутых посьпехах нельга супакойвацца. Калі асноўны прарыў у справе падрыхтоўкі да сяўбы і калектывізацыі ліквідаваны, дык ёсьць яшчэ паасобныя недахопы, якія могуць адбіцца на далейшай працы калгасаў і ў справе калектывізацыі. Кулацтва выгнана ня з усіх калгасаў, у паасобных калгасах і цяпер яшчэ прымаюць чужыя элементы.

Пераважная колькасьць калгасаў недаацэньвае жаночую працу ў той час, як жаночая праца з посьпехам замяняе працу мужчын. Так, калгас «НОВЫ ШЛЯХ, Гмыбачанскага сельсавету, арганізаваў спэцыяльныя жаночыя брыгады па паляводзтве, якія ня горш, а часамі і лепш, спраўляюцца з працай, чым брыгады мужчын.

Дрэнна ў калгасах арганізавана сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Толькі паміж калгасам «1-га мая», Сушанскага сельсавету, і калгасам «Чырвоны амагар» заключана ўмова на сацспаборніцтва. Райкалгасаюз недаацэньвае гэтай асноўнай формы камуністычных мэтадаў працы, ня кіруе ёю.

Зьдзельшчына, уведзеная ва многіх калгасах, высока ўзьняла прадукцыйнасьць працы.

Прыкладам перабудовы работы калгасаў у сувязі з пераходам на зьдзельшчыну, зьяўляецца калгас «Зьвязда», Усьвейскага сельсавету, які спаткаў сяўбу ў поўнай баявой гатоўнасьці.

У гэтым калгасе яшчэ зімою, у часе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, некаторыя работы былі пераведзены на зьдзельшчыну.

Цяпер зьдзельшчына праведзена па ўсіх відах работ. Яна ўзьняла прадукцыйнасьць працы, яна забясьпечыла пасьпяховы ход сяўбы. Нормы выпрацоўкі, намечаныя на рабочы дзень, выконваюцца і перавыконваюцца.

Вось прыклады:

Дзьве брыгады па ворыве параконнымі плугамі пры заданьні ўздымаць палціну канюшыніча па норме 0,4 гэктара ў дзень на чалавека ўздымалі па 0,6 гэктара ў дзень. Заворваньне іржыніча—норма 1,2 гэкт. на параконных плуг, выпрацоўвалі ня менш 2 гэкт., па баранаваньні ў два сьляды па норме 2 гэкт. на каня ў дзень выпрацоўвалі—6 гэкт.

Такія посьпехі тлумачацца яшчэ і тым, што коні ўтрымліваюцца добра. Калгас «Зьвязда», пры вялікім недахваце корму, усё-ж захаваў непарушным браніраваны фуражны фонд у колькасьці 100 цэнтн. канюшыны, 33 цэтн. сена.

Вывазка гною па норме вызначана ў адзін дзень на чалавека з канём, пры вывазцы на адлегласьць 1,25 клм., 40-пудовыя вазы—12 вазоў, вывозяць-жа 18. Пры разьбіўцы гною на полі, замест 15 вазоў на чалавека, разьбіваюць 25.

Па доглядзе 125 сьвіней, плюс парасят з загатоўкай корму, пасьбай на полі, мыцьцём і інш., спраўляюцца пяць жанчын.

Акопваньне фруктовых дрэў: норма акапаць старыя дрэвы наўкола камля на адзін рабочы дзень 12 дрэў, а акопваюць 20, маладыя дрэвы—норма 30, а акопваюць 60.

Па ручной сяўбе вызначалася норма 2 гэкт., на справе-ж засяваюць чатыры.

Кожны крок па зьдзельшчыне сьведчыць аб нязмернай яе карысьці і для калгасу, і для калгаснікаў.

Нявыхады на работу і спазьненьні амаль зьнішчаны. Кожны ведае сваю работу, кожны сьпяшаецца на працу.

Праўленьне вымушана прыняць меры для зьнішчэньня імкненьняў, западта расьцягнуць працоўны дзень і тым самым перагрузіць каня.

У калгасе «Зьвязда» зьдзельшчына дала ўзоры сацыялістычнай калектыўнай працы.

«Зьвязда»—прыклад для іншых калгасаў.

А. МІКУЦКІ.

НЕАДКЛАДНА АЗДАРАВІЦЬ КАЛГАС „ЗАРА ВЕСКІ“

ЧАШНІКІ.

У калгас «Зара вёскі» за год ня ўступіла ні адзін бядняцка-серадняцкай гаспадаркі.

Калі прагледзець гаспадарчае становішча калгасу, дык стане зусім ясна, чаму няма прыліву ў гэты калгас.

Справа ўліку і наогул рахункаводзтва ў калгасе пастаўлена зусім кепска. Ёсьць рахункавод, які скончыў курсы і адольны наладзіць улік, але які гультайнічае і нічога ня робіць. У мінулым старшынёю калгасу растрачана 400 руб. калгасных грошай, цяпер пры папярэдняй праверцы рэвіз. камісіяй таксама выяўлен недахват грошай.

Сярод калгаснікаў ёсьць шмат спрачак, якія выносяцца на вёску і скарыстоўваюцца кулацтвам у антыкалгаснай агітацыі. У асобных калгаснікаў ёсьць рвацкія настроі. Слабы палітычны і культурны ўзровень калгаснікаў.

Узаемаадносіны калгаснікаў з аднаасобнікамі надта дрэнныя. Пры адводзе зямлі для яравога засеву калгасу дапушчан перагіб. Калгасная зямля знаходзіцца каля самай вёскі, і аднаасобнікам няма нават кудой выганяць сваю жывёлу, бо трэба або гнаць па калгасных пасевах, або выгарадзіць прагон каля ½ клм.

Усе гэтыя моманты перашкаджаюць наладжаньню добрасуседзкіх адносін з беднякамі і сераднякамі—аднаасобнікамі і ўцягненьню іх у калгас.

Лазукоўскі сельсавет і партыйная ячэйка ня прымаюць мер па аздараўленьні работы калгасу. Райкому КП(б)Б і райкалгасаюзу трэба зараз-жа прыняць меры па ўпарадкаваньні гэтага калгасу. Неабходна ачысьціць калгас ад варожых і рвацкіх элементаў, аздаравіўшы яго увядзеньнем зьдзельшчыны. Партячэйка і сельсавет павінны сыстэматычна кіраваць калгасам.

Х. В.

Апартуністы зрываюць падрыхтоўку жывёлагадоўчых кадраў

Для здавальненьня патрэб сьвінагадоўчай гаспадаркі БССР, у гэтым годзе трэба выпусьціць з ВНУ 184 зоатэхнікаў па сьвінагадоўлі з вышэйшай адукацыяй і 704 з сярэдняй. Да канца пяцігодкі патрэбнасьць гэта яшчэ больш павялічваецца. Існуючыя зараз навучальныя ўстановы ня ў стане забясьпечыць патрэбы сельскай гаспадаркі ў спэцыялістах.

Гэта вымагае ад нашых навучальных устаноў сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў па выхаваньні новых кадраў. Але ня ўсюды яшчэ разумеюць важнасьць гэтай задачы. Прыкладам могуць паслужыць адносіны чачэрскіх раённых арганізацый да сьвінагадоўчага тэхнікуму.

На працягу амаль паўгода раённыя арганізацыі зусім на цікавіліся сьвінагадоўчым тэхнікумам, адкрытым у Чачэрску. Студэнты ня прыцягваліся да ўдзелу ў калгасным будаўніцтве, у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Калі студэнты зьвярнуліся ў местачковы савет з просьбай даць ім работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, старшыня ім адказаў: «У мяне ўсё ў парадку і ваша дапамога непатрэбна».

На працягу больш месяца адміністрацыя тэхнікуму абівае порагі РВК і спажывецкага таварыства на пытаньні аб памяшканьні для інтэрнату і аб арганізацыі грамадзкага харчаваньня студэнтаў, забесьпячэньня іх абуткам і г. д. На усе просьбы старшыня РВК адказвае, што «Рапсі, чыя адкрываць тэхнікум, Наркамзем павінен быў пабудаваць уласныя памяшканьні». У спажывецкім таварыстве адказалі, што тэхнікум ня ўключаны ў плян забесьпячэньня.

Райком партыі таксама патурае такім адносінам да навучальнай установы. Гэта ставіць пад пагрозу зрыву заняткі 45 студэнтаў асеньняга прыёму мінулага году і 67 студэнтаў веснавога прыёму 1931 году.

Трэба дадаць, што ў раёне ёсьць усе магчымасьці для забесьпячэньня патрэб тэхнікуму.

Т. К.

10 проц.— бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Хоцімшчыны

на першага мая ЎСТУПІЛІ Ў КАЛГАСЫ

ХОЦІМСК, 8.

Сьвята 1-га мая дало 10 ПРОЦ. новага прыліву ў калгасы раёну. Зараз па раёне калектывізавана 50 ПРОЦ. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

БЯРОЗКАЎСКІ, ХОЦІМСКІ, ЗАБЯЛЫШАНСКІ, ЕЛЬНЯНСКІ сельсаветы калектывізаваны на 75-80 ПРОЦ. У гэтых сельсаветах калгасы вышлі ў поле на веснавую сяўбу. Назіраецца масавы выезд аднаасобнікаў разам з калгасамі на сяўбу. Аднаасобнікі ў часе выхаду ў поле просяць залічыць іх у калгасы, яны здаюць фуражны фонд, насеньне і аграмаджваюць цягавую сілу. Па гэтых сельсаветах мяркуецца правядзеньне суцэльнай калектывізацыі да канца веснавой сяўбы.

Раённыя арганізацыі ня ўжываюць мер да арганізацыйнага афармленьня і ўмацаваньня арганізаваных калгасаў.

Выезды калгасаў у поле паказалі, што паасобныя калгасы ня зусім падрыхтаваны да веснавой сяўбы. Асабліва дрэнна з забесьпячэньнем насенным і фуражным фондамі. Ні ў адным з калгасаў ня складзены фуражныя фонды. У некаторых калгасах не хапае насенных матар'ялаў. Напрыклад, у калгасе «III-І Інтэрнацыянал» не хапае насеннага аўса 400 пудоў ды іншага насеньня пудоў 200.

Трэба зараз заняцца арганізацыйным афармленьнем і замацаваньнем арганізаваных калгасаў і дапамагчы ім выйсьці арганізаванымі калёнамі на дугую бальшавіцкую сяўбу.

ПАРТКОР.

Патрэбна тэрміновая дапамога

СЯЛІБА. (Па тэлеграфу). Толькі 3 га мая паказалі мяжу сьвінагадоўчаму саўгасу. Набор у Сьвіслацкім раёне. Трэст Сьвінавод галавацінскі кіруе саўгасам. Замест неабходнейшых машын (трактарныя плугі) у саўгас зараз прысылалі сані.

Не абсьлодваўшы масыву саўгасу, «сплянавалі» яравы клін у 350 гэкт., выходзячы з паяўнасьці 174 рабочых. У сапраўднасьці-ж у саўгасе толькі 68 рабочых. Саўгас сваімі сіламі ня можа перавезьці 1.166 цэтн. угнаеньня.

З прычыны дыскусіі, ці быць саўгасу сьвінагадоўчым, а таксама з-за недахвату цьвікоў, спынена будаўніцтва.

Ні адна з раённых арганізацый не аказвае саўгасу ніякай канкрэтнай дапамогі. Замест патрэбных тысячы цэнтнэраў бульбы, у саўгасе ёсьць толькі 3. З-за недахвату гаручага і тары трактар «Фардзон» прымушан будзе спыніць работу. Сельсавет імкнецца выкруціцца ад аказаньня дапамогі саўгасу рабочай і цягавай сілай.

Каб папярэдзіць зрыў сяўбы ў саўгасе, яму неабходна аказаць тэрміновую дапамогу, адгрузіўшы безадкладна патрэбныя машыны, насеньне. Раённыя арганізацыі павінны дапамагчы саўгасу сваёй рабочай і цягавай сілай.

Рабкор **Цяленчук.**

КАМЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (НАШ КАР.).

Па Каменскім сельсавеце дарожнае будаўніцтва — пад пагрозай зрыву. Заданьне па камнязагатоўках амаль поўнасьцю правалена. Мясцовыя арганізацыі не прынялі мер да забесьпячэньня выкананьня пляну вывазкі каменю. Кулацка-заможныя гаспадаркі ўвесь час сабатавалі вывазку каменю, а сельсавет адносіўся да гэтага прымірэнча і не прымушаў кулакоў выконваць дырэктывы заданьні.

Сельсавет даўёў цьвёрдыя заданьні толькі да 10 кулацкіх гаспадарак. Між тым, у сельсавеце ёсьць 35 кулацкіх гаспадарак.

2-га мая быў арганізован суботнік па вывазцы каменю, аднак, сельсавет ня змог правесьці яго належным чынам, выкарыстаць актыўнасьць мас. У выніку суботнік даў вельмі мала карысьці.

Г. ХАСЬКІН

Неадкладна прыступіць да перабудовы спажыўкаапэрацыі

Пастанова ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу, апублікаваная ў «Правдзе» ад 12 мая, мае выключнае гістарычнае значэньне для ўсёй работы спажывецкай каапэрацыі ў цэлым і кожнай арганізацыі ў паасобку.

Гэты важнейшы дакумант неабходна ведаць рабочаму, калгаснику, бедняку, батраку і ў першую чаргу—кожнаму работніку спажыўкаапэрацыі дакладным чынам ня толькі прачытаць, але і вывучыць для таго, каб глыбока зразумець прычыны буйных недахопаў і памылак у рабоце спажывецкай каапэрацыі, бо толькі зразумеўшы гэта, стане ясным чаму робіцца такі круты, але зусім неабходны і верны паварот у адносінах перабудовы ўсёй работы.

Між тым, ужо выяўляецца паасобныя настроі і гаворкі права-«лявацкага» разважаньня аб нібы некаторым разыходжаньні паміж устаноўкамі гэтага дакумэнту з устаноўкамі, данымі ў пастановах сьнежаньскага пленуму ЦККП УсеКП(б) аб рабоце спажывецкай каапэрацыі і шляхох яе рэарганізацыі.

Што гаворыць пастанова ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу аб стане работы спажывецкай каапэрацыі. Яна гаворыць наступнае:

«Асноўным недахопам у сучаснай рабоце спажыўкаапэрацыі зьяўляюцца неаваротлівасьць і бюракратызм у рабоце, якія вядуць да замарожваньня таваразвароту, у выніку чаго нярэдка штучна ствараецца беставар'е, пры значным павялічэньні таварных лішкаў на складах».

Што прывяло работу каапэрацыі да такога стану? З выключнай выразнасьцю дае адказ на гэта пытаньне пастанова ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу, дзе гаворыцца:

«Гэтыя недахопы ў рабоце спажыўкаапэрацыі тлумачацца, галоўным чынам, тым, што, выцясьніўшы прыватнікоў і заваяваўшы манапольнае становішча на рынку, спажыўкаапэрацыя пачала нагарджаць прынцыпам гаспадарчага разрахунку і задачай разгортваньня савецкага гандлю, памылкова меркуючы, што ўжо насьпелі ўмовы для непасрэднага пераходу да простага прадуктаабмену. Пры гэтым спажывецкая каапэрацыя забылася, што выцясьненьне прыватніка з прыватнага гандлю яшчэ не значае вынішчэньня ўсякага гандлю, што, накдварох, выцясьненьне прыватнага гандлю, мае на ўвазе ўсямернае разьвіцьцё савецкага гандлю і разгортваньне сеткі каапэрацыйных і дзяржаўных гандлёвых арганізацый па ўсім СССР».

Такім чынам, пры супастаўленьні ацэнкі недахопаў і памылак у рабоце спажыўкаапэрацыі, данай у пастановах ЦК УсеКП(б) ад 15 мая 1930 году, у пастановах XVI партзьезду, сьнежаньскага пленуму ПК і ЦКК УсеКП(б) і пленуму ЦК КП(б)Б і ацэнкі недахопаў і памылак, данай у апошняй пастанове ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу, робіцца зусім відавочным, што ЦК на працягу ўсяго апошняга пэрыяду пасьлядоўна і з усёй сілай мабілізаваў увагу ўсёй партыі, рабочай класы і ўсёй каапэрацыйнай сыстэмы на зьяшчэньне буйнейшых недахопаў і памылак у рабоце спажыўкаапэрацыі — арганізацыі, заклікай адыгрываць вялізарнейшую ролю ва ўсім разгорнутым сацыялістычным будаўніцтве.

Сьмелы і рашучы крок, зроблены ў апошнім дакумэнце ў бок перабудовы ўсёй работы спажыўкаапэрацыі, зьяўляецца нічым іншым, як працягам тых мерапрыемстваў, якія партыя вызначала і праводзіла ў апошні час для паляпшэньня работы спажывецкай каапэрацыі.

Паводле дырэктыў партыі, скончана рэарганізацыя сельскай сеткі, створаны на вёсцы выбарныя органы каапэрацыі—сельспажыўтаварыствы; створана сетка ЗРК пры асноўных буйных прадпрыемствах, якія (ЗРК) ўжо зусім сябе апраўдалі, як лепшая форма абслугоўваньня рабочага спажыўца і ўцягненьня шырокіх мас у работу каапэрацыі. Адшырокіх мас у работу каапэрацыі. Адпоўнена транспартная і водная каапэрацыя, што ў сваю чаргу, бязумоўна, палепшыла абслугоўваньне рабочых чыгуначнага і воднага транспарту, паблізіла каапэрацыю непасрэдна да вытворчасьці.

Таму, прыведзеныя вышэй настроі і разгаворчыкі павінны намі расцэньвацца, як яўна апартуністычныя, і па іх трэба з усёй сілай біць.

У чым заключаецца выключнае гістарычнае значэньне пастановы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу для ўсёй партыі, рабочай і клясы, для самой сыстэмы спажывецкай каапэрацыі?

Гэты дакумант яшчэ раз з усёй сілай выкрыў буйнейшыя недахопы і памылкі ў рабоце спажыўкаапэрацыі, даўшы зусім правільны аналіз прычын гэтых недахопаў і вызначыў зусім правільны шляхі далейшага разьвіцьця і перабудовы ўсёй работы спажыўкаапэрацыі.

Першае—гэта спэцыялізацыя ўсёй гандлёвай дзейнасьці спажывецкай каапэрацыі, што, бязумоўна, прывядзе да паляпшэньня абслугоўваньня спажыўца, спрашчэньня кіраўніцтва справай забесьпячэньня, паскарэньня таваразвароту, забесьпячэньня ўліку попыту спажыўца і ўзмацніць увагу сыстэмы да пытаньняў якасьці прадукцыі.

ЦК УсеКП(б), СНК Саюзу і Цэнтрасаюз у сваёй пастанове ўказваюць, што пры Цэнтрасаюзе павінны быць створаны ўсесаюзныя галінавыя аб'яднаньні на гуртовым гандлі, а ў рэспубліках—рэспубліканскія аб'яднаньні па раздробным гандлі. Гэтыя рэспубліканскія галінавыя аб'яднаньні па раздробным гандлі павінны быць пабудаваны на прынцыпах поўнага гаспадарчага разрахунку, самастойным балянсе, поўным адзіначальлі кіраваньня, са сваёй уласнай розьнічнай сеткай і складской тарнай і транспартнай гаспадаркай.

Як практычна мы думаем гэта правесьці ў нас, у БССР?

Асноўнае — гэта з такой-жа рашучасьцю, адпаведна пастановам пленуму ЦК КП(б)Б, мы павінны неадкладна прыступіць да стварэньня рэспубліканскіх галінавых аб'яднаньняў па роздробным гандлі, як: па гатовай вопратцы, мануфактуры, галянтарэі, трыкатажы, скуры і абутку; сілікатных таварах, канцытарскіх вырабах, мэблі, дровах і інш. гаспадарчых таварах, культаварах, мясе, рыбе і птушцы.

Зусім відавочна, што пры такой арганізацыі спэцыялізацыі гандлю ўжо зараз паўстае рад пытаньняў з боку паасобных ЦРК аб тым, якая будзе ўвязка розьнічнай сеткі ЦРК з розьнічнай сеткай галінавых аб'яднаньняў Белкаапсаюзу і наогул, ці патрэбна розьнічная сетка ЦРК пры арганізацыі гэтых аб'яднаньняў. На гэтыя пытаньні, якія выклікаюць розныя разважаньні, неабходна адразу даць вычарпальны адказ.

Па-першае, гутарка ідзе аб перадачы гэтым аб'яднаньням Белкаапсаюзу розьнічных гандлёвых спэцыялізаваных магазынаў. Па-другое, у абавязак гэтых аб'яднаньняў будзе ўваходзіць пашырэньне сеткі спэцыялізаваных магазынаў. Значыць ад ЦРК да галінавых аб'яднаньняў пяройдзе толькі тая частка розьнічнай сеткі, якая зьяўляецца спэцыялізаванай.

Ці азначае гэта ліквідацыю розьнічнай сеткі ЦРК. Ні ў якай меры. У ЦРК застаецца вялікая сетка закрытых разьмеркавальнікаў, універсальных магазынаў, прадуктовых, бакалейна-гастранамічных, вінных і хлебных магазынаў. Так што ўсё гэтыя разважаньні носяць характар ні больш ні менш як паніка-ўтворства, бюракратычнага чапляньня за старыя формы работы, боязьні перабудаваць работу на новых пачатках.

Побач з гэтым зусім выразна выпадае пытаньне аб паскарэньні таваразвароту са скасаваньнем практыкі нармаваньня продажу тавараў, пакідаючы часовае нармаваньне паасобных найбольш дэфіцытных відаў тавару, скасоўваецца практыка браніраваньня тавараў, якая да апошняга часу ў рабоце нізавых каапэрацыйных арганізацый і ў органах Наркамснабу атрымала шырокае ўжываньне, што побач з агульнай непаваротлівасьцю і няўменьнем самой сыстэмы маніпураваць таварнымі фондамі, паглыбляла ўсю гандлёвую дзейнасьць і узмацніла ўсю правільна адзначаныя ў пастанове ЦК УсеКП(б), СНК Саюзу і Цэнтрасаюзу моманты замарожваньня таватаразвароту і г. д. Аднак, брань ваховае сваю сілу для найбольш важных з пункту гледжаньня народна-гаспадарчага значэньня мерапрыемстваў, як лесараспрацоўкі, лесасплаў, пуціна і сэзонныя віды загатовак—яйкі і масла.

Зусім ясна павінна быць для ўсёй сыстэмы спажыўкаапэрацыі, што такое мерапрыемства, як скасаваньне нармаваньня і браніраваньня тавараў, ні ў якай меры не азначае разгортваньня гандлю для гандлю. Гутарка ідзе аб разгортваньні савецкага гандлю, а гэта значыць, паваротку гандлёвай дзейнасьці сыстэмы тварам да запытаньняў вытворчасьці, запытаньняў паасобных раёнаў, забесьпячэньня завозу і продажу тавараў у пэрыяды правядзеньня важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Мяса і малочныя ПРАДУКТЫ—РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

Рашуча змагацца з разбазарваньнем мясных і малочных прадуктаў на мясцох

Ажыцьцявіць пляны кантрактацыі малака

Калегія НК РСІ БССР у сваёй пастанове па дакладу аб кантрактацыі малака адзначыла, што пастанова студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб кантрактацыі малака ня выканана, плян загатовак малака за першы квартал сарваны, што пагража забесьпячэньню рабочых цэнтраў. Наркамснаб правяў бязьдзейнасьць у адносінах плянаваньня і кіраўніцтва загатоўчымі арганізацыямі. Белкаапсаюз, Белмалжывсаюз ня выканалі пастановы ЭКАНА аб сканчэньні кантрактацыі малака да 15 студзеня. Крупскі, Быхаўскі, Хоцімскі РК і РВК вусім не аддалі ўвагі кантрактацыі малака, спасылаючыся на розныя «аб'ектыўныя» прычыны, перагрузку кампаніямі і г. д. Сакратар Хоцімскага райкому т. Міроненка заявіў, «калі кантрактуюць каровы, гады ня трэба кантрактаваць малака». У выніку апартуністычнай недаацэнкі кантрактацыі, усе сыстэмы здалі 6 проц. пляну. Цьвёрдыя заданьні не даведзены да кулацкіх гаспадарак, выкананьне кантрактацыі ідзе галоўным чынам за лік аграмаджанага сэктару.

Калегія НК РСІ прапанавала Наркамснабу даць жорсткую дырэктыву загатоўчым арганізацыям аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацкіх гаспадарак. Цэнтральным загатоўчым арганізацыям прапанавана праверыць ход кантрактацыі малака і падрыхтаванасьць маслазаводаў, прыцягнуць да судовай адказнасьці вінаватых у невыкананьні дырэктывы аб здачы малака.

Калегія забараніла выдаткаваньне малочных прадуктаў без нарадаў Белкаторы Саюзмалака.

Месьніцтва—замест плянавай работы

У радзе раёнаў наглядаецца разбазарваньне малочных прадуктаў, месьніцкія пастрсі, ігнараваньне дырэктыў аб забесьпячэньні рабочых цэнтраў. Па Гарадоцкім раёне выканана 33,2 проц. пляну здачы малака. Цьвёрдыя заданьні не даведзены да кулацка-заможных гаспадарак. У раёне мала цікавяцца кантрактацыяй малака, больш клапоцяцца аб забесьпячэньні мясовых патрэб. Напрыклад, прыгарадная гаспадарка, якая знаходзіцца каля м. Гарадок, замест таго, каб здаваць малако на завод, здае яго ў харчэўню. За 6 тыдняў было такім чынам перадана звыш 2.000 літраў малака і 857 літраў сьметаны. Белкаапсаюз даведаўся аб гэтым толькі тады, калі інструктар правяраў загатоўкі малака ў раёне. На запытаньне прадстаўніка Белкаапсаюзу старшыня Гарадоцкага райспажыўсаюзу Кац адказаў: «Я ня ведаў, калі нельга, дам распараджэньне спыніць перадачу сьметаны ў харчэўню».

Хоцімскі раён выканаў плян здачы малака на 15 проц. Там разбазарана малака з прыгарадных гаспадарак і калгасаў звыш 1.300 літраў.

Такі-ж малюнак і ў Віцебскім раёне. Трэба рашуча ўдарыць па выпадках разбазарваньня малака і прымусіць раёны выканаць пляны забесьпячэньня рабочых цэнтраў.

Мінскі.

З МЕСЦ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

Паведамленьні рабселькораў з месцаваць малюнак ходу загатовак жывёлы. Рабселькоры адзначаюць, што загатоўкам мяса не аддана належная ўвага з боку мясовых арганізацый.

Тав. Я. Жылка паведамляе, што Слуцкі раён увесь час адстае ў загатоўках жывёлы. Да 1 мая ён выканаў 75,8 проц. пляну. Такі процант выканаўня пляну,—падкрэсьлівае т. Жылка,—ставіць над пагрозу бесьперабойнае забесьпячэньне мясапрадуктамі прамысловых цэнтраў і насьпяховае ўкамплектаваньне стада сацыялістычнага сэктару.

Тав. Зьм. Вішнёвы піша з Ельскага раёну, што В. Бакаўскі сельсавет праваліў загатоўкі жывёлы, заданьне ні выканана нават на 10 проц. Кулакі сабатуюць здачу жывёлы, ня ўжываецца ніякіх мер, каб спагнаць цьвёрдыя заданьні.

Такі-ж малюнак, паводле заметкі т. А. Лося, у Плешчаніцкім раёне. Трэба было загатовіць 40 кароў, здана толькі 30; замест 88 сьвіней, загатоўлена 23, замест 79 авечак—3. Кулацка-заможныя гаспадаркі адмаўляюцца здаваць жывёлу—замест 29 штук кароў яны здалі 15, замест 39 сьвіней—13.

Тов. Лось падкрэсьлівае, што сельсаветы павінны прыцягнуць да адказнасьці тых, хто дапамагае кулаку сабатаваць загатоўкі.

Тав. «Барацьбіт» з Касьцюковіцкага раёну піша, што раён, які трапіў на чорную дошку на мясазагатоўках, павінен быць «прэміяваны», за «посьпехі» ў самазабесьпячэньні. Загатоўшчыкі забясьпечваюць мясам усіх раённых работнікаў.

Спагнаць сродкі з кулакоў

У Дукорскім сельсавеце збор сродкаў на культурнае будаўніцтва павінен быць даўно скончаны. Але і на сёнешні дзень застаецца за заможнікамі неспагнаных каля 1.500 руб., у той час, як беднота сваё заданьне выкапала. Па аднэй толькі вёсцы Дукора лічыцца запазычанасьці 207 р.

На сельсавеце лічыцца 619 р. запазычанасьці па самазабкладаньні, значная частка якой таксама прыпадае на заможнікаў.

Дукорскі сельсавет па-прымірэнцку адносіцца да кулацтва. Партыйная ячэйка не дапамагае сельсавету ў мабілізацыі сродкаў.

Патрэбна спагнаць з кулакоў запазычанасьць і моцна ўдарыць па апартуністых, якія зрываюць мабілізацыю сродкаў.

Я. ЗОРКА.

Кіруючыя работнікі Любаньшчыны займаюцца... папяваньнем

ЛЮБАНЬ.

Кіруючыя арганізацыі Любаньшчыны аддаюць зусім мала ўвагі адгрузцы ульбы. Замест таго, каб мабілізаваць акоп гэтай важнейшай кампаніі ўвесь актыў, шырокую думку грамадзкасьці, раённыя арганізацыі проста бязьдзейнічаюць. Вось характэрны факт. 24-га красавіка ў райкоме КП(б)Б павінна была адбыцца нарада па пытаньні аб узмацненьні адгрузкі ульбы. Да вызначанага часу зьявіліся ўсе адказныя работнікі апрача... сакратара райкому ЛАГУЦЕНКА і старшыні райспажыўсаюза ЯНУШЭЎСКАГА. Іх відавочна зусім ня цікавіла пытаньне аб адгрузцы ульбы. Замест таго, каб быць на нарадзе, яны выехалі... на папяваньне.

Ня дзіўна што Любанскі раён плянецца ў хвасьце. Спажыўкаапэрацыя за ўвесь час загатовіла толькі капя трох вагонаў ульбы.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца работай кіруючых арганізацый Любаньшчыны і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у злачыннай бязьдзейнасьці.

МІБОР.

У 14 гадавіну Кастрычніка будзе пушчана новая аўтаматычная тэлефонная станцыя

Шырока разгарнулася работа па скончэньні пабудовы менскай аўтаматычнай тэлефоннай станцыі. Ужо вядзецца падрыхтоўка для пракладкі падземнага кабэлю.

Прыступлена да пракладкі кабэляў ва ўстановах. Пракладка кабэляў працягнецца да 15 жніўня. У бліжэйшы час пачнуцца работы па мантажы абсталяваньня станцыі.

Пабудова станцыі будзе скончана 1 лістапада 1931 году. Урачыстае адкрыцьцё адбудзецца ў кастрычніцкія сьвяты.

На пленуме праўленьня БелАПП'у

За творчы рост за бальшавіцкую партыйнасьць пралетарскай літаратуры!

З залі пасяджэньня

15 раніцою працягваўся даклад тав. Бэндэ. Ён заняў большую частку пасяджэньня. Потым з дакладам аб шляхох БелАПП'аўскай паэзіі выступіў тав. **М. Аляхновіч.**

— Перад кожным паэтам-беларусам,—гаворыць ён,—ва ўвесь рост паўстае зарая праблема аўладаньня мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, праблема палітычна-мастацкай вучобы, упар тай работы над словам.

Кожны паэт павінен добра ўсьведамляць усе задачы, якія ставіць перад ім штодзенна бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва. Мастацкій твор будзе мець грамадзкае значэньне і вагу толькі тады, калі ён арганічна вырасьце з унутранога сьветаадчуваньня паэта.

Кажучы пра рост нашай пралетарскай паэзіі, тав. Аляхновіч зазначае, што 1930-31 г. г. далі значную колькасьць новых імён маладых, адольных паэтаў (**А. Зарыцкі, Ап. Прудзікаў, З. Віталін** і інш.), большасьць з якіх—рабочыя-ўдарнікі.

* * *

Палітычна-мастацкі рост нашых пісьменьнікаў і паэтаў—бясспрэчны. Беларуская пралетарская літаратура, бязумоўна, у самым хуткім часе найбольш поўна адлюструе вялізарнейшыя падзеі ўнутры першай у сьвеце краіны дыктатуры пралетарыяту, адлюструе працэс фармаваньня новага чалавека сацыялістычнага грамадзтва.

* * *

15-га на вячэрнім пасяджэньні пленум заслухаў даклады: тав. **Бранштэйна** (аб творчасьці яўрэйскай сэкцыі БелАПП'у) і тав. **Гальперынай** (па творчым пытаньні).

Тав. **Кучар**, які ўзяў слова ў спрэчках, спыніўся на нашай пралетарска-калгаснай літаратуры, у прыватнасьці—на творчасьці С. Баранавых.

* * *

16-га зранку тав. **Ап. Сапагуб** выступіў з судакладам аб рэвалюцыйнай паэзіі Заходняй Беларусі.

— У нас насьпела неабходнасьць,—гаворыць у заключэньне тав. **Сапагуб**,—стварэньня спэцыяльнай часопісі, накшталт украінскай «Заходняй Украіны», якая-б адлюстроўвала жыцьцё і змаганьне нашых братоў па клясе на ўмовах ня чучуванага фашысцкага тэрору.

Пасьля гэтага адкрыліся шырокія спрэчкі па ўсіх дакладах аб творчых шляхох БелАПП'у.

Пленум вітала **дэлегацыя 1-га ўсебеларускага зьлёту дзяткораў.**

— Мы заклікаем вас, пралетарскіх пісьменьнікаў Савецкай Беларусі,—гаворыць маленькі чалавек у чырвоным гальштуку,—на фронт дзіцячай камуністычнай літаратуры, на фронт такой літаратуры, якая-б добра выхоўвала новых, добрых людзей!

Адказнае слова даецца тав. **Галавачу.** У спрэчках выказваюцца т. т. **Ржэўскі, Лужанін, Таўбін, Баранавых** і інш.

Лачаф будзе гэраічным атрадам нашай літаратуры

Прамова сакратара „Локаф"—тав. Матэ-Запке

Таварышы, пралетарыяту мала толькі ўзяць уладу. Уладу гэту неабходна і ўмацаваць. Уладу трэба абараніць, гарожую гадзіну, кожную хвіліну і трэба быць напагатове. У нас ёсьць пройдзены слаўны шлях—Чырвонай армі. Наша армія мае балвы гэраічны шлях.

Узброеная абарона рэвалюцыі і па гэты час таксама актуальна, як і была раней і гэта актуальнасьць усё больш і больш паглыбляецца. Літаратурная грамадзкасьць усяго Саюзу ўлічвае тую акалічнасьць, што супроць нас шалёна пачынае ўсьпрыхтоўвацца вайна, што нам трэба быць пільна зьвязанымі з Чырвонай арміяй, разам стаяць на варце нашых заваяваньняў, таму мы пастанавілі стварыць аб'яднаньне пісьменьнікаў Чырвонай арміі і флёту.

Таварышы, традыцыі ня могуць быць створаны без фіксаваньня тых гэраічных учынкаў і шляхоў, якія прайшла узброеная сіла рэвалюцыі—наша армія. Таму «ЛОКАФ» павінен напісаць мастацкую гісторыю Чырвонай армі, бо Чырвоная армія ўвойдзе ў гісторыю сацыялістычнага будаўніцтва як плошчадь ад плошчадзі пралетарыяту. Таму кожны пролетарыяту, які лічыць сябе адданым работнікам Савецкага Саюзу, кожны пралетарскі пісьменьнік і паэта павінны стаць у рады «ЛОКАФ'у» і асабліва гэта адносіцца да самай блізкай адлегласьці ад ворага. Я думаю, і ўвесь «ЛОКАФ» так думае, што беларускі ЛАЧАФ будзе гэраічным атрадам нашай літаратуры.

На вас кладзецца вялікая і адказная задача

Прамова Серафімовіча

Ад імя «ФОСП'а» дазвольцо перадаць вам самае гарачае і таварыскае прывітаньне (аплёдысмэнты) і асабліва ад вашай ўсходняй сястры—ад РАПП'а.

На вас, як і на ўсіх пралетарскіх і рэвалюцыйных пісьменьнікаў, ня толькі Саюзу, але і ўсяго сьвету, ляжыць вялікая адказная задача. Той працэс—гаспадарча-палітычны, які перарабляе сьвет—і ў гэтых адносінах вы далёка пайшлі ў бок сацыялістычнай будоўлі—гэты працэс патрэбна мастацкі асмысліць і перадаць у масы.

Я ведаю, у вас гэты творчы працэс ідзе наперад. Зразумела, як і ва ўсім Саюзе, тут не без барацьбы. Буржуазія і не рэшткі не здаюцца без бою і ў вас таксама ішла і ідзе барацьба як і па ўсім Саюзе, але і тут па ўсіх адзнаках вы перамагаеце.

Дазвольце ў гэтай рабоце пажадаць вам самых найбольшых посьпехаў. (Аплёдысмэнты).

Шырэй работу па закліку-ўдарнікаў у літаратуру

Прамова ўдарніка заводу „АМО"—тав. Сапава

Вітаючы ваш пленум ад імя рабкораў Масквы, я хочу вам расказаць аб тым, як мы працуем на нашых заводах і фабрыках. Мы—рабкоры заводаў—вядзем жорсткую барацьбу за ўзьнімаьне працоўнай дысцыпліны, за поўнае выкананьне прамфінпляну.

У сваёй рабкораўскай рабоце мы пішам пра тое, як перамагаем труднасьці, як вядзем барацьбу з адсталымі элементамі і г. д.

Мы бярэм усё на аловак. Пішам аб недахопах, паказваем нашы посьпехі.

Мы—рабкоры — прымаем удзел на толькі ў рабоце заводзкіх газэт, але нашы вопыт перадаем шырокім масам праз цэнтральны друк.

Мы заклікаем ўцягваць у літаратуру лепшых ударнікаў. Гэта адна з важных задач, якая накіравана на ўздым нашай індустрыі, на разьвіцьцё прамысловасьці.

Я заклікаю пленум і ўсіх ударнікаў да таго, каб як мага шырэй разгарнуць работу па закліку ўдарнікаў у літаратуру. (Аплёдысмэнты).

Закрыўся пленум БелАПП'у

Увечары 16 мая, пасьля заключнага слова тав. Бэндэ, пленум перайшоў да арганізацыйных пытаньняў.

Пленум ухваліў вывесьці са складу праўленьня асацыяцыі **З. Бандарыну, Ал. Вечара Бумбэра** (літоўская сэкцыя). У праўленьне ўведзены тт. **Александровіч, Бэндэ, Мельнікаў** (Гомель), **Люгоўскі** (Віцебск), **Адаскі** (Бабруйск), два рабочыя-ўдарнікі: т. **Малашонак** (завод імя Варашылава) і тав. **Швэйдэль** (друкарня імя Сталіна) і **тры пісьменьнікі-чырвонаармейцы**, члены БелЛАЧАФ'у.

У нанава сканструяваны сакратарыят увахо́дзіць 11 асоб: **П. Галавач, А. Сянкевіч, М. Лынькоў, А. Александровіч, Я. Ліманоўскі, Л. Бэндэ, Мысьлінскі** (польская сэкцыя), **Бранштэйн, Вітэнзон** (яўрэйская сэкцыя), **Малашонак і Швэйдэль.**

Першым сакратаром праўленьня БелАПП'у выбран **Платон Галавач**, другім сакратаром — **Міхась Лынькоў.**

Пленум зацьвердзіў дэлегацыю БелАПП'у ва Ўсесаюзным Аб'яднаньні Асацыяцый Пралетарскіх Пісьменьнікаў («ВААПП'е»); у складзе — тт. **Галавача, Лынькова, Сянкевіча, Ліманоўскага, Мысьлінскага, Аршанскага.** У рэвізійную камісію ВААПП'у выбран, замест Ал. Вечара, тав. **Бранштэйн.**

Пленум выбраў таксама дэлегацыю БелАПП'у ў фэдэрацыю аб'яднаньняў савецкіх пісьменьнікаў БССР, што неўзабаве арганізуецца.

Закрываючы пасяджэньне, тав. **Галавач** выказаў упэўненасьць у тым, што Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будзе і надалей упарта змагацца за новыя творчыя посьпехі, за бальшавіцкую партыйнасьць пралетарскай літаратуры.

На ўсебеларускім зьлёце дзяткораў

— Зьлёт яшчэ не пачынаецца, хаця ўсе дэлегаты ўжо «зьляцеліся». Госьці—менскія піянэры-дзяткоры — таксама зьявіліся своячасова. ЦБ ДКА — на месцы.

— Сьцены фойе стракацяць насьценгазэтамі. Па газэце лёгка пазнаць твар школы. Брудная, сумная газэта **Менскай 8-ай школы** выразна сьведчыць аб дрэннай рабоце апошняй. Такая газэта зусім ня вабіць увагу дэлегатаў. Аброскі па афармленьні, добры па зьмесьце бюлетэнь ударнай дзяткораўскай брыгады **Дубровенскай сямігодкі** прымушае дэлегатаў зьвярнуць на сябе ўвагу.

— На вялікіх шчытох цэнтральныя дзіцячыя камуністычныя газэты БССР —«Піянэр Беларусі» і «Юнгер ленінец» дэманструюць свае дасягненьні.

На выстаўцы—мадэлі машын, розныя прыстасаваньні і г. д. Вучань чыгуначнай школы сканструяваў паравы рухавік, другі—трансформатар, трэці—рэастат...

— Брыгада піянэраў-эспэрантыстаў Гомелю арганізавала куток сувязі з заграніцай. 20 піянэраў-энтузіястаў наладзілі сувязь з піянэрскімі і камсамольскімі арганізацыямі Нямеччыны, Англіі, Швэцыі, Аўстрыі, Францыі, Галяндыі, Чэха-Славакіі і г. д.

— Зьлёт адкрывае старшыня ЦБ ДКА тав. **Гайдукевіч.**

Выбіраецца дзелавы і ганаровы прэзыдыум. У ганаровы—**Палітбюро ЦК УсеКП(б), сакратар ЦК УсеЛКСМ тав. Косярэў, Максім Горкі, рэдактары «Правды» і «Комсомольской правды».**

— Ад Культпропу ЦК КП(б)Б зьлёт вітае тав. **Курцін.**

— Быць калектыўным арганізатарам працоўнай дзетвары вакол задач партыі, выхоўваць стойкіх ленінцаў—задача дзіцячага камуністычнага друку. Дзіцячы друк павінен быць востра адточан.

— Удзельнікі зьлёту павінны прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні месячніка друку і Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

— 6 тысяч дзяткораў Заходняй вобласьці і Смаленская газэта **«Юный пионер»** вітаюць 1-шы ўсебеларускі зьлёт дзяткораў—тучна гаворыць дзяткор Заходняй вобласьці **Дзьякоў.**

— **Старшынствуе на зьлёце—14-цігадовы дзяткор Пілюга.**

— **Пілюга**—былы дэлегат ад БССР на міжнародны зьлёт піянэраў у Бэрліне. Савецкая дэлегацыя ня была дапушчана на бэрлінскі зьлёт. Пілюга даў рад артыкулаў у «Піянэр Беларусі» аб гэтай справе. Ён цяпер вядомы ўсёй піянэрыі БССР.

— Голас Пілюгі чуецца па ўсёй залі: слова для дакладу аб задачах піянэрарганізацыі, выходзячы з пастаноў IX-га ўсесаюзнага і X-га ўсебеларускага зьездаў ЛКСМ мае тав. **Гайдукевіч.**

— Піянэрарганізацыя разам з камсамолам і партыяй прымае актыўны ўдзел у рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Пад кіраўніцтвам камсамолу піянэрыя дапамагае партыі калектывізаваць сельскую гаспадарку, змагаецца за выкананьне прамфінпляну на прадпрыемстве, за сацыялістычныя мэтады працы—ударніцтва.

— Яшчэ ня ўсюды добра з палітхнізацыяй школ. Піянэрскія арганізацыі ў радзе месц працуюць па-старому—зусім не навярнуліся да вытворчасьці.

— **Беларускі і яўрэйскі пралетарскія паэты САЛАГУБ і ЛІЎШЫЦ вітаюць зьлёт ад імя другога пленуму БелАПП'у.**

— **«Буревестнику» рэвалюцыі — Максіму Горкаму зьлёт пасылае прывітальную тэлеграму.**

— **Пасылаецца прывітальная тэлеграма «Пионерской правде».**

— **На трыбуне — яўрэйскі пралетарскі паэт ІЗЯ ХАРЫК.**

— **Тав. Харык зачытвае ўрыўкі сваёй паэмы «Круглыя тыдні», якую ён зараз піша. Вершы Харыка сустракаюцца бурнымі воплескамі.**

Дзяткоры на зьлёце

„Чырв. Зорка" Пач. у 7; 8.45; 10.30 — З 15 мая лепшы фільм сезону **Экспанат з паноптыкуму** Звыш праграм.—хроніка саюзкіно № 20

„Культура" Пач. у 7; 8.45; 10.30 — З 15 мая новы фільм **ДЖЫМ ШВАНТЭ** З выш праграм. камедыя **Ротэ і Джульета.**

Інтэрнацыянал Пачат. 1 с. у 7 г. — З 14 мая настацкі фільм паводле апавяданьня Гоўаля **САРАЧЫНСКІ КІРМАШ**

„Пралетарый" Пач. у 7 гадз. — З 15 мая нямецкі фільм **ПРАБУДЖЭНЬНЕ ЖАНЧЫНЫ** Драма ў 6 частк.

„Юны Піянэр" Пач. з 1 г. дня. — Эпізод з грамадзянскай вайны **БУХТА СЬМЕРЦІ** драма ў 7 частках.

„СПАРТАК" Пач. у 6-30; 8; 9-50 і 11 Касы—з 5 гадз. — З 11-га мая выдатны фільм **ПРАСТЫТУТКА** драма ў 7 частках.

Патрэбна ВОПЫТНАЯ МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову. Звяртацца: Савецкая 63, 2-ой паверх, выдавецтва «Зьвязда»

Камарынскім РК КП(б)Б і РКК)—(склікаецца)—(раённы зьлёт рабселькораў і рэдкалегій насьценгазэт на 24 мая 1931 г., у 11 гадз. раніцы. З ПАРАДКАМ ДНЯ: 1) Вынікі Ўсесаюзнага рабселькораўскага зьлёту. 2) Нізавы друк і яго роля ў сацыялістычнай перабудове вёскі. На раённы зьлёт рабселькораў павінны зьязіцца селькоры, насьценкоры, юнкоры, члены рэдкалегій насьценгазэт школьных, калгасных, камсамольскіх і г. д., хатнікі, чырвонаармейцы і сакратары парт. камсамольскіх ячэек.

Цэнтральная кіно-рамонтная майстэрня **Белдзяржкіно,** Менск, Рэвалюцыйная, 4, **прымае ў рамонт** кіно-праекцыйную апаратуру усіх сыстэм як стацыянарных, так і перасовак. **Атрыманы ўсе кіно-часткі** да апаратаў «Патэ», «Томп» і «Гоз» усіх выпускаў. **БЕЛДЗЯРЖКІНО.**

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ! Падпіска на газэту «ЗЬВЯЗДА» на ЧЭРВЕНЬ і наступныя месяцы будзе прымацца ПОШТАЙ **толькі да 26 мая**. Для акуратнага і бесьперабойнага атрыманьня газэты з 1-га чэрвеня трэба падпісацца зараз-жа! Падпіска, зданая пасьля 26-га мая, будзе выконвацца толькі з ліпеня м-ца.

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

Вышла з друку і разасланa падпісчыкам —(ЧАСОПІСЬ)— „Беларуская Работніца і Сялянка" № 13—май—1931 г.

19 мая г.г. у 12 гадз. дня, у доме Асьветы (пакой № 4) АДКРЫВАЕЦЦА **Усебеларуская канфэрэнцыя па пэдагагічнай асьвеце** На канфэрэнцыю запрашаюцца рабочыя прадпрыемстваў г. Менску, настаўніцтва і навуковыя працаўнікі

Менск, друкарня «Зьвязды».

Лесасплаву—большавіцкіх тэмпы

БЕЛКААПСАЮЗ ЗРЫВАЕ забесьпячэньне сплаву таварамі

Неадкладна ажыцьцявіць пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб арганізацыі спэцыяльнай сыстэмы лясной каапэрацыі

Ход сплаву

Паводле вестак Лесбелу на 10 мая ў БССР пушчана ў сплаў 385.000 кмб. драўніны. Да канчатковых пунктаў прыбыла 8.000 кмб. (Бабруйскаму камбінату — па р. Бярэзіне, заводу «Зьвязда» — па р. Прыпяці). На прыстанёх спажыўцом здана 70.000 кмб. драўніны.

Сураскі лесгас прэміяваны заперавыкананьне пляну

21 КРАСАВІКА ў «ЗЬВЯЗЬДЗЕ» БЫЛА ЗЬМЕШЧАНА ЗАМЕТКА АБ ТЫМ, ШТО СУРАСКІ ВУЧЛЕСГАС ПЕРАВЫКАНАЎ ПЛЯН ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ; ШТО ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ ЛЕСАЗАГАТОВАК ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЭМІЯВАНЫ. У АДКАЗ ГЭТУ ЗАМЕТКУ ЛЕСБЕЛ ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО СУРАСКАМУ ВУЧЛЕСГАСУ ЗА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ВЫЗНАЧАНЫ НАСТУПНЫЯ ПРЭМІІ: 4 МЕСЦЫ НА КУРОРЦЕ ПАБУДОВА ДОМУ НА 8.000 РУБ., ПАБУДОВА КЛЮБУ НА 15.000 РУБ. ГЭТЫЯ ПРЭМІІ БУДУЦЬ АБМЕРКАВАНЫ І ВЫДАНЫ НА ЗЬЛЕТЫ ЎДАРНІКАЎ ВУЧЛЕСГАСУ, ЯКІ АДБУДЗЕЦЦА ГЭТЫМІ ДНЯМІ.

Мабілізаваць масы плытагонаў —на барацьбу з кулацкай агітацыяй на сплаве

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на сплаве дагэтуль разгорнута вельмі слаба. Саюз лесдрэўрабочых мала цікавіцца гэтай справай. Сацспаборніцтвам ахоплена ня больш 10 проц. усіх плытагонаў. Паасобныя сплаўныя канторы (Віцебская) пераходзяць на брыгадныя мэтады працы, але і там сацспаборніцтва вельмі павольна разгортваецца.

Па Тураўскім сплаўным вучастку некаторыя арцелі плытагонаў самі заключылі паміж сабой сацдагавары і выконваюць іх з посьпехам. Рабочком не разгарнуў сярод плытагонаў культурна-масавай работы і ня кіруе сацспаборніцтвам.

Культурна-масавая работа зараз, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, набывае асаблівае значэньне. Кулак ня сьпіць, ён імкнецца пралезьці на сплаў, ён вядзе агітацыю сярод плытагонаў. На Тураўшчыне кулаччо распаўсюджвала цэлую «праграму» рвацкіх запатрабаваньняў да сплаўных канторы. Гэтым спробам кулацтва трэба даць бліскітасны адпор. У адказ на імкненьні кулацтва падарваць плян сплаву, прафарганізацыі павінны мабілізаваць масы плытагонаў на барацьбу з клясавым ворагам, на перавыкананьне пляну ў знакам шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Забесьпячэньне плытагонаў не наладжана

Каапэрацыя зрывае дастаўку таварай

ПОЛАЦАК. (Наш.кар.). Бурная паводка г.г. ня прынесла асаблівых страт Полацкаму леспрамгасу. Дзякуючы своячасовай мабілізацыі сіл, румы ня былі сарваны. Зараз па р. Палоты, Сошніцы і Вушачы пушчаны першыя плыты, якія патрапяць ужо ўвосьдзіць у Дзьвіну. Агулам на вадзе ўжо ёсьць 20% усіх вывезеных лесаматар'ялаў. Сплаў экспартных матар'ялаў забясьпечан рабочай сілай. Падпісаны дагавары на 1.480 рабочых, якія будуць працаваць на лесасплаве ці пачатку да канца работ. Увесь экспартны лесаматар'ял мяркуецца сплавіць да канца верасьня.

Горшая справа з работамі на сплаве лесаматар'ялаў для ўнутранога спажываньня. Напрыклад, дагэтуль падпісаны дагавары толькі на 600 рабочых у той час, як патрэбны 800 чал.

Нездавальняюча наладжана забесьпячэньне сплаву прадуктамі і прамтаварамі. Райсаюз нічога не робіць, каб палепшыць дастаўку таварай. На лесазаводзе ёсьць сталоўка, якая будзе абслугоўваць і плытагонаў, але ёю могуць карыстацца толькі 30 чал.; усіх рабочых, якія працуюць на сплаве, яна ні ў якім разе задаволіць ня можа. Трэба адкрыць яшчэ рад сталовых.

А. ШУСТРЫ.

Хамуты і шлеі „збіраніяваны фонд" сплаву

ЗЭМБІН. (Наш кар.). Зэмбінскі вучастак павінен толькі першым сплавам пусьціць 117.000 кмб. будаўнічай драўніны, вывезенай на прыстані Плешчаніцкага леспрамгасу. Ня гледзячы на гэта, што рэкі ўвайшлі ў берагі, падрыхтоўка да сплаву не забясьпечвае поўнага выкананьня заданьня. Дагэтуль пушчана толькі 17.000 кмб.—12 проц. Каапэрацыйныя арганізацыі ня выканалі дырэктывы аб забесьпячэньні сплаву прадуктамі і прамтаварамі. Бягомльскі рай. саюз не завёз на сплаў ніводнага матэрыялу мануфактуры і гатовага адзеньня, замест чаго забраніраваў у якасьці сплаўных фондаў шлеі і хамуты.

Плешчаніцкі райсаюз таксама не завёз на пункты сплаву прамтары і прадукты. Чайныя і сталоўкі на сплаве не адкрыты. Сплаўны вучастак ніяк ня можа дагаварыцца з каапэрацыйнымі арганізацыямі. Больш таго, няма пляну адкрыцьця сталовак.

В-ч.

На Магілеўскім вучастку не хапае рабочай сілы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Магілеўскі леспрамгас вусім слаба падрыхтаваўся да выкананьня важнейшых заданьняў па сплаве лесаматар'ялаў. Рабочай сілай прыстані не забясьпечаны. Патрэбны 200 чал., ёсьць толькі 100, на якіх заключаны дагавары. У асабліва пагражаючым становішчы сплаў 6.000 кубамэтраў для Рэчыцкага лесазаводу. Для гэтага сплаву патрэбны 40 чал., дагэтуль няма ніводнага.

Магілеўскі леспрамгас мае заданьне да 1 ліпеня пусьціць у сплаў 52.000 кубамэтраў. Да сёнешняга дня 20.000 кбм. лесаматар'ялаў яшчэ ня вывезены да сплаўных рэк.

Ня выканана дырэктыва аб забесьпячэньні рабочых прадуктамі. Леспрамгас павінен быў на аднэй з буйных прыстаняй адкрыць сталоўку, але ніякіх меры да арганізацыі сталоўкі ня ўжыты.

Сельсаветы амаль не дапамагаюць леспрамгасу ў вярбоўцы рабочай сілы. Вярбоўка вядзецца старымі мэтадамі, на аснове арганізацыі сельскіх і калгасных брыгад.

Леспрамгас павінен пераключыцца на бальшавіцкія тэмпы работы.

«К. М.».

Забясьпечыць дрывамі рабочыя цэнтры

Чэрвень—ударны месячнік ліквідацыі прарываў у вывазцы дроў

Невыкананьне заданьня па загатоўках і вывазцы лесаматар'ялаў і дроў сьведчыць аб тым, што большасьць леспрамгасаў ня здолела арганізаваць грамадзкасьць для пасьпяховага ажыцьцяўленьня пляну, для барацьбы з дэмабілізацыйнымі настроямі, кулацкай агітацыяй і рвацкімі запатрабаваньнямі паасобных арцеляй.

Невыкананьне праграмы пагражае забесьпячэньню апалам заводаў і працоўнага насельніцтва БССР.

„З 1 студзеня па 1 мая па БССР загатоўлена 21,3 проц. гадавога пляну па дрывах і вывезена 35,7 проц. Недапушчальна адстаюць наступныя леспрамгасы: **Асіпавіцкі** загатовіў толькі 9,9 проц. заданьня па дрывах, **Бярэзінскі**—6,9 проц., **Глускі** — 7,4 процентаў, **Тураўскі** — 4,7 проц., **Хойніцкі** — 5 проц., **Тураўскі** раён вывез толькі 14,8 проц. пляну, **Глускі**—18,9 проц., **Чачэрскі**—20,7 проц., **Лепельскі**—22,4 проц.

Для поўнай і своячасовай ліквідацыі прарываў у загатоўках і вывазцы дроў неабходна:

— **Зараз-жа разгарнуць сярод насельніцтва растлумачальную працу аб вялікім значэньні загатовак дроў для народнай гаспадаркі.**

— **Абвясьціць з 1 чэрвеня надзвычайны ўдарны месячнік па загатоўцы і вывазцы дроў.**

— **Разгарнуць ударны рух на загатоўках, шырока ўжываючы сацспаборніцтва лесарубаў і возчыкаў.**

— Аддзел мэханізацыі Лесаўкаапэрацыі павінен зараз-жа прыступіць да самага шырокага ажыцьцяўленьня пляну мэханізацыі і рацыяналізацыі лесазагатовак.

У часе правядзеньня месячніка ўсе работнікі леспрамгасаў павінны быць мабілізаваны на фронт загатовак для ліквідацыі прарыву.

АБРАЖЭВІЧ.

Паведамленьні

— 18 мая, у 7 гадз. веч., у арг.-інструкт. сэктары НСПСВ (Дом Прафсаюзаў 2-гі паверх, пакой № 4) адбудзецца нарада добраахвотнікаў арг.—інструктараў сэктару. З прычыны важнасьці пытаньняў, своячасовая яўка добраахвотнікаў абавязкова.

— 18 мая, у 7 г. веч., у анатам. корпусе адбудзецца агульны сход навук. і тэхн. працаўнікоў Мэдінстытута.

Адказны рэдактар **С. БУДЗІНСКІ.**

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты

пічыць несапраўднымі

Каап. кн. т-ва «Зямляроб» Хмыз А. Я., 79 * Каап. кн. т-ва «Зямляроб» Коцен С. Г., 80 * Камс. б. 314414 Самадушка І. Г., 81 * Чл. б. с. дрэваапр. Тваро́ўскага Ж., 82 * Вайск. б. Саракача А. В., 83 * Чл. б. СГЛР 39642 пасьв. ас. 49, пасьв., каманд. Трактарацэнтру Тулупава І. М., 84-87 * Чл. б. швэйн. 217839 Унгера М. Р., 88 * Чл. б. с. буд. Гэель Е. І., 89 * Дав. к-ры «Менлесапілка» № 437 Шымановіча М. Р., 90 * Камс. б. 98610 Баўбеля Т. Д., 91 * Пасьв. ас. 47/П МВБ ч. Парнікеля Н., 92 * Чл. б. с. буд. Зайцава Н. І., 93 * Чл. б. с. швэйн. Файвусовіча С. М., 94 * Дав. МЦРК Мішчанка В. С., 95 * Квіт. калг. «Бальшавік» Новака Я. В., 96 * Лек. кн. Шыманскага Я. Я., 97 * Пэнс. кн. Сак. М. Т., 98 * Вайск. б. Шустэрмана І. Е. 99 * Паш. Ка